А. А. Квяткоўскі

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## *Фанетыка, арфаэпія, арфаграфія. Склад слова і словаўтварэнне*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка

*А. А. Квяткоўскі*

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА: ФАНЕТЫКА, АРФАЭПІЯ, АРФАГРАФІЯ. СКЛАД СЛОВА І СЛОВАЎТВАРЭННЕ

*Дапаможнік*
*для слухачоў падрыхтоўчага аддзялення і падрыхтоўчых курсаў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск
БДПУ
2020

УДК 811.161.3(075.8)
ББК 81.2(4Беи) – 923
К32

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ
(пратакол № 3 ад 16.09.2019 г.)

Рэцэнзенты:
*А. М. Аўчыннікава,* кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай БДУ;
*А. У. Жардзецкая,* кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай і залежнай літаратуры БДПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Квяткоўскі, А. А.**
К32 Беларуская мова : фанетыка, арфаэпія, арфаграфія. Склад слова і словаўтварэнне : дапаможнік для слухачоў падрыхтоўчага аддзялення і падрыхтоўчых курсаў / А. А. Квяткоўскі. – Мінск : БДПУ, 2020. – 84 с.
ISBN 978-985-541-676-1.

У дапаможніку прадстаўлены тэарэтычныя матэрыялы па раздзелах «Фанетыка, арфаэпія, арфаграфія», «Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія». Практычная частка змяшчае тэставыя заданні для замацавання і праверкі вывучанага матэрыялу.

Адрасуецца слухачам факультэтаў даўніверсітэцкай падрыхтоўкі і падрыхтоўчых курсаў, а таксама для самападрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай мове.

УДК 811.161.3(075.8)
ББК 81.2(4Беи) – 923

ISBN 978-985-541-676-1

© Квяткоўскі А. А., 2020
© Афармленне. БДПУ, 2020

# ПРАДМОВА

Зборнік адрасуецца ўсім тым, хто рыхтуецца да здачы пісьмовага тэсціравання па беларускай мове.

Выданне складаецца з тэарэтычных раздзелаў і падраздзелаў і практычных заданняў (для самастойнага выканання), а таксама з тэстаў па праверцы ведаў абітурыентаў. Формай і зместам усе практычныя заданні максімальна набліжаны да тых, якія былі на цэнтралізаваным тэсціраванні на працягу апошніх пяці гадоў.

Дапаможнік можа быць выкарыстаны як для аўдыторных заняткаў, так і для самастойнай работы. Ён будзе карысны не толькі для слухачоў падрыхтоўчых аддзяленняў і курсаў, але і для выкладчыкаў школ, гімназій, ліцэяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# *Фанетыка, арфаэпія, арфаграфія*

## Тэма 1
## Фанетыка і арфаэпія

### 1.1 Галосныя і зычныя гукі і літары
(агульная характарыстыка)

Гукі—найменшыя моўныя адзінкі, з якіх складаецца слова, а літары—знакі для перадачы гукаў на пісьме. Гукі мы чуем, а літары пішам і бачым.

У беларускай мове 45 гукаў.З іх 6 галосных і 39 зычных. Галосныя гукі [а, о, у, ы, і, э], зычныя [б, б’, в, в’, г, г’(фрыкатыўныя), г, г’(выбухныя), д, дж, дз, дз’, ж, з, з’, й’, к, к’, л, л’, м, м’, н, н’, п, п’, р, с, с’, т, ў, ф, ф’, х, х’, ц, ц’, ч, ш].

Для абазначэння 45 гукаў выкарыстоўваюцца 32 літары, якія і складаюць беларускі алфавіт: а, б, в, г, д, е, ё, ж, з, і, й ( і нескладовае), к, л, м, н, о, п, р, с, т, у, ў (у нескладовае), ф, х, ц, ч, ш, ы, ь, э, ю, я.

Для перадачы галосных гукаў на пісьме ёсць 10 літар: а, е, ё, і, о, у, ы, э, ю, я. Літары а, о, у, ы, э абазначаюць адзін галосны гук—той, што чуецца ў назве літары, калі вышэйназваныя літары ўжываюцца толькі пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных ці ў пачатку слова: мыла—м[ы]ла, дуб—д[у]б, казка—к[а]зк[а],р[э]ха, [э]ра, [а]рка, [о]рдэн. Калі ж гэтыя літары стаяць пасля зычнай, то служаць для абазначэння галосных гукаў [а, о, у, ы, і, э] і паказваюць на мяккасць папярэдняга зычнага: к[л’о]н, [л’удз’і], [з’а]м[л’а]к. Гэтыя ж літары (іх у такім выпадку называюць ётавымі) могуць абазначаць два гукі: [й’]+адпаведны галосны гук: е—[й’+[э], ё—[й’]+[о], [й’]+[і], [й’]+[у], [й’]+[а]. Гэта бывае ў наступных пазіцыях:

1) у пачатку слова*: іншы—[й’і]ншы, есці—[й’э]сці, ёлка--[й’о]лка,юшка—[й’у]шка, ярына—[й’а]рына;
2) пасля галоснай у сярэдзіне ці на канцы слова: паехаць—па[й’э]хаць,краіна—кра[й’і]на,маё—ма[й’о], тваю—тва[й’у], мая—ма[й’а];
3) пасля апострафа: п’еса—п[й’э]са, пад’ём—пад[й’о]м, ад’ютант—ад[й’у]тант;
4) пасля раздзяляльнага мяккага знака: мільён—міл[й’о]н, мільярд—міл[й’а]рд;
5) пасля ў (у нескладовага): шчаўе—шчаў[й’э], салаў[й’і]ны.

Гук [і ] у моўнай плыні пад уплывам суседніх гукаў можа змяняць сваю якасць:

1)пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных, акрамя [г,к, х], гук [і] вымаўляецца як [ы]: брат і сястра—брат [ы] сястра, таварыш і брат—таварыш [ы] брат, бортінжынер—борт[ы]нжынер,палітінфармацыя—паліт[ы]нфармацыя, але смех і грэх—смех [і ]грэх,Мінск і Гомель—Мінск [і] Гомель,снег ідзе—снег [і]дзе;
2) у пачатку слова (пры адсутнасці паўзы) гук [і] вымаўляецца як [й’]: сястра і брат—сятра [й’] брат, у Івана—да [й’]вана, да Ігната—да [й’]гната.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 1.2 Асаблівасці класіфікацыі галосных гукаў

Пры класіфікацыі галосных гукаў улічваюць месца ўтварэння і спосаб утварэння. Па месцы ўтварэння ( у залежнасці ад рухаў языка ў гарызантальным напрамку (уперад—назад) і ад таго, якая частка спінкі языка (пярэдняя, сярэдняя ці задняя) актыўна артыкулюе) выдзяляюцца галосныя:

1) пярэдняга рада – [і, э];
2) сярэдняга рада—[а, ы];
3) задняга рада—[о, у].

Спосабам утварэння таго ці іншага галоснага гука служыць адпаведны пад'ём языка па вертыкалі і ўдзел ці няўдзел губ у яго ўтварэнні. Адрозніваюць тры ступені пад'ёму:

1) галосныя верхняга пад'ёму—[і, у, ы] (язык у найбольшай ступені падняты да паднябення;
2) галосныя сярэдняга пад'ёму—[о, э] (спінка языка мае сярэдні пад'ём);
3) галосная ніжняга пад'ёму—[а] (спінка языка мінімальна паднята).

Галосныя [у, о] утвараюцца пры ўдзеле губ і называюцца лабіялізаванымі (лац.labia—губа). Астатнія галосныя гукі—нелабіялізаваныя.

## 1.3 Асаблівасці класіфікацыі зычных гукаў

При класіфікацыі зычных гукаў улічваюцца 4 прыметы **:

1) удзел голасу і шуму (г.зн. удзел ва ўтварэнні галасавых звязак);
2) наяўнасць або адсутнасць змякчэння (г.зн. наяўнасць дадатковых рухаў языка ў напрамку да цвёрдага паднябення);
3) месца ўтварэння (г.зн.перашкоды на шляху выдыхаемага паветра);
4)спосаб утварэння (г.зн. спосаб пераадолення перашкоды).

Паводле ўдзелу голасу і шуму адрозніваюць наступныя зычныя гукі:

1)парныя па глухасці/звонкасці (усяго 13 пар):[б-п, б'-п', г-х (фрыкат.), г'-х' (фрыкат.), г-к (выб.), г'-к' (выб.), д-т, дз-ц, дз'-ц', дж-ч, ж-ш, з-с, з'-с';
2) няпарныя звонкія (санорныя)—такія гукі, пры ўтварэнні якіх голас пераважае над шумам.Да санорных адносяць: [в-в', л-л', м-м', н-н', й', ў, р];

З а ў в а г а. У адрозненне ад астатніх звонкіх санорныя гукі ніколі не аглушаюцца: ні на канцы слоў, ні перад глухімі: сы[р], со[н], за[мк]нуць.

Па прымеце цвёрдасці/мяккасці зычныя гукі падзяляюцца на 3 групы:

1) парныя па цвёрдасці/мяккасці (усяго 15 пар): [б-б', в-в', г-г'(фрыкат.), г-г'(выб.), д-дз', з-з', к-к', л-л', м-м', н-н', п-п', с-с', т-ц', ф-ф', х-х'];
2) няпарныя цвёрдыя (зацвярдзелыя): [ж, дж, р, ў, ч, ш, дз, ц];
3) няпарны мяккі [й'].

З а ў в а г і. 1.Зычныя гукі [дж, ж, ч, ш] называюцца шыпячымі (у сувязі з шыпячым характарам вымаўлення), а [дз, дз', з-з', с-с', ц, ц'] свісцячымі (у сувязі са свіцячым характарам вымаўлення).

2. Свісцячыя гукі [дз, дз', ц, ц'] не з'яўляюцца парнымі па цвёрдасці/мяккасці ,бо [дз] і [ц] зацвярдзелыя: [дз]от, [дз]ынкаць, [ц]ыркуль, [ц]ытата. Мяккім жа [дз'] і [ц'] адпавядаюць цвёрдыя [д] і [т] (з'ява

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзекання і цекання): [д]ва—[дз’]ве, сера[д]а—сера[дз’]е, пар[т]а–на пар[ц’]е, чыс[т]ы—чыс[ц]ейшы.

## 1.4 Прыклады асіміляцыі ў беларускай мове

Асіміляцыя (ад лац.assimilatio—прыпадабненне гукаў аднаго класа да другога у межах фанетычнага слова. Асноўнай прычынай узнікнення асіміляцыі з’яўляецца артыкуляцыйная звязнасць гукаў.

У праграме школьнага курса разглядаюцца наступныя віды асіміляцыі:
1) асіміляцыя па мяккасці: ча[ц’в’]ер, [с’н’]ег, [з’ л]есу;

2) асіміляцыя па звонкасці/глухасці: футбол—фу[дб]ол, касьба—ка[з’б]а,дзядзька—дзя[ц’к]а, бярозка—бяро[ск]а;

3) асіміляцыя па шыпячасці/свісцячасці: пясчынка—пя[шч]ынка, пры дачцэ—пры да[цц]э.

## 1.5 Некаторыя правілы вымаўлення зычных у беларускай мове

1)зычныя [з, с] ніколі не змякчаюцца перад [г’, к’, х’] (заднеязычнымі): [ск’]інуць, [сх’]іліць, [зг’]інаць. У астатніх выпадках гэтыя гукі змякчаюцца: [с’л’]іва, [з’м’] ена, [с’н’]ег;

З а ў в а г а. Гук з вымаўляецца цвёрда ў словах у на[зв’]е, аб пры[зм’]е, пры феадалі[зм’]е.

2) гукі [н, л] вымаўляюцца мякка перад [дз’, й’, н’, ц’]: на фро[н’ц’]е, ка[н’й’а]к, малі[н’н’]ік;

3) у словах з трохгукавым спалучэннем зычных гук н не змякчаецца: здра[нц’в’]елы, ка[нс’п’]ект;

4) гук [н] звычайна змякчаецца перад [з’, л’, с’]: гартэ[н’з’]ія, гама[н’л’]івы, пе[н’с’]ія;

З а ў в а г а. Гук [н] вымаўляецца цвёрда ў словах бе[нз’]ін, у рама[нс’]е, тра[нз’]іт.

5) у службовых словах (перш за ўсё прыназоўніках)канцавыя [з] і [с] змякчаюцца: бе[з’ м’]яне, [з’ л’]ідай

6) звонкія зычныя вымаўляюцца нязменна перад звонкімі (у тым ліку і перад санорнымі) і перад галоснымі.Аглушэнне звонкіх адбываецца толькі перад глухімі.Напрыклад: на[д б]эзам, [з в]оза, але на[т ш]колай.

З а ў в а г а. Свісцячыя перад шыпячымі на стыку самастойных слоў захоўваюцца нязменна: Але[с’ ж]артуе.

## 1.6 Заданні для самастойнага выканання

№1. Адзначце словы, у якіх літары е, ё, і, ю, я абазначаюць два гукі:

1) Маіна;
2) Мар’я;
3) мёд;
4) Юрась;
5) нюхаць.

№2. Адзначце словы, у якіх літары е, ё, і, ю, я служаць для абазначэння мяккасці папярэдніх зычных і абазначаюць адзін гук:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) лясны;
2) цёмны;
3) Іўе;
4) юла;
5) ціха.

№3. Адзначце словы, у якіх ёсць два гукі [ы]:
1) заіскрыцца;
2) аўтаінспектары;
3) дэзынфармацыя;
4) бортінжынеры;
5) міжінстытуцкі.

№4. Адзначце радок, у якім літара і абазначае гук [і] ва ўсіх словах:
1) у іх, у іншых, снег ідзе;
2) у маіх, у Індыі, маё і тваё;
3) імпарт, смех і грэх, аб’інелы;
4) рэкі, мой і твой, грак і галка;
5) Маіна, вераб’і, скіфы.

№5. Адзначце словы, у якіх два галосныя гукі стаяць побач:
1) сальфеджыа;
2) кітаец;
3) туя;
4) тэарэма;
5) альвеола.

№6. Адзначце словы, у якіх ёсць тры гукі [ы]:
1) дырыжоры;
2) палітінфарматары;
3) звышініцыятыўны;
4) контрігры;
5) з Іванам.

№7. Адзначце словы, у якіх ёсць два гукі [й’]:
1) майстэрня;
2) яе;
3) сціхні (загадны лад);
4) з Ірынай;
5) з ялінай.

№8. Адзначце словы, вымаўленне якіх не супадае з напісаннем:
1) акіслены;
2) экзотыка;
3) скібіна;
4) выправаджваць;
5) сабакаводства.

№9. Адзначце словы, вымаўленне якіх супадае з напісаннем:
1) дожджык;
2) дождж;
3) верасень;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) звышімклівы;
5) Міхась.

№10. Адзначце словы, у якіх правільна адзначаны выпадкі супадзення (несупадзення) напісання і вымаўлення:
1) ліпень (не супадае);
2) скептык (супадае);
3) вакзал (супадае);
4) закрываць (не супадае);
5) з нябёс (супадае).

№11. Адзначце словы, у якіх спалучэнні літар **д** і **з** абазначаюць два гукі:
1) аддзяўбці;
2) адзываць;
3) адзімаваць;
4) адзінарны;
5) адзначыць.

№12. Адзначце словы, у якіх спалучэнні літар **д** і **ж** абазначаюць адзін гук:
1) адгароджаны;
2) аджыць;
3) дажджынка;
4) аджаць;
5) ураджайны.

№13. Адзначце словы, пры формазмяненні якіх адбываецца адбываецца з’ява дзекання ці цекання:
1) горад;
2) тыраж;
3) чыста;
4) свет;
5) павуцінне.

№14. Адзначце словы, у якіх адбываецца асіміляцыя зычных гукаў:
1) смела;
2) гаспадарыць;
3) яна;
4) гаспадарыць;
5) як быццам.

№15. Адзначце словы, у якіх адбываецца асіміляцыя зычных па звонкасці:
1) Рагнеда;
2) вакзал;
3) грузчык;
4) сашчаміць;
5) футбол.

№16. Адзначце словы, у якіх адбываецца асіміляцыя зычных па глухасці:
1) дзядзька;
2) адчуванне;
3) згінуць;
4) таварыства;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5) замкнуць.

№17. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх адбываецца асіміляцыя па мяккасці:

1) снягі;
2) васьмёрка;
3) чацвер;
4) з нябёсаў;
5) бацька.

№18. Адзначце словы, у якіх няма суседняй мяккасці зычных гукаў:

1) праталінка;
2) альховы;
3) лісцік;
4) расцвітаць;
5) пралеска.

№19. Адзначце правільныя транскрыпцыі слоў:

1) [цв’іла];
2) [яй’э];
3) [скроз’];
4) [дарошк’];
5) [рас’л’іны].

№20. Адзначце памылкова запісаныя транскрыпцыі слоў:

1) [сл’ады];
2) [пал’юй’э];
3) [й’янотаў];
4) [л’охк’і];
5) [з’м’эшаны].

№20. Адзначце правільны варыянт транскрыпцыі слова **мядзветка**:

1) [м’адзв’этка];
2) [м’адзв’эдка];
3) [мядз’в’етка];
4) [м’адз’в’этка];
5) [мядзветка].

№22. Адзначце словы, у якіх два мяккія гукі:

1) з’езд;
2) смех;
3) адвіслы;
4) паехалі;
5) скіба.

№23. Адзначце словы, у якіх сустракаюцца няпарныя зычныя па глухасці/звонкасці:

1) футбол;
2) сцежка;
3) бяроза;
4) дождждык;
5) лістапад.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

№24. Адзначце словы, у якіх падкрэсленыя літары абазначаюць гук [ш]:

1) расчысціць;
2) шчасце;
3) морж;
4) дарожны;
5) вяртаешся.

№25. Устанавіце адпаведнасць паміж падкрэсленымі літарамі і гукамі, якія яны абазначаюць:

| | |
|---|---|
| А. Расчасаць | 1. [с’] |
| Б. Святло | 2. [з] |
| В. Касьба | 3. [с] |
| Г. Мароз | 4. [ш] |
| | 5. [з’] |

1) А3Б5В1Г2;
2) А4Б5В1Г3;
3) А4Б1В5Г3;
4) А3Б1В5Г2;
5) А4Б1В5Г2.

№26. Устанавіце адпаведнасць паміж падкрэсленымі літарамі і гукамі, якія яны абазначаюць:

| | |
|---|---|
| А. Грузчык | 1. [з] |
| Б. Звіць | 2. [ш] |
| В. Перавозка | 3. [с’] |
| Г. Калодзезь | 4. [с] |
| | 5.[з’] |

1) А1Б5В4Г3;
2) А2Б5В1Г3;
3) А2Б4В1Г3;
4) А2Б4В1Г3;
5) А2Б5В4Г3.

№27. Адзначце словы, у якіх ёсць толькі глухія зычныя:

1) падсушыць;
2) адсвяткаваць;
3) абкат;
4) распазнаваць;
5) кніжка.

№28. Адзначце словы, у якіх усе зычныя звонкія:

1) вакзал;
2) дожджык;
3) дождж;
4) моладзь;
5) марозлівы.

№29. Адзначце правільныя сцверджанні:

1) у беларускай мове аднолькавая колькасць галосных гукаў і літар;
2) у беларускай мове 46 гукаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) мяккасць папярэдняга зычнага у беларускай мове абазначаецца літарамі е, ё, і, ю, я і мяккім знакам;

4) колькасць літар у рускай і беларускай мовах не супадае;

5) санорныя зычныя ніколі не аглушаюцца.

№30. Адзначце характарыстыкі, якія адпавядаюць слову <u>***адчуванне***</u>:

1) у слове 9 літар, 8 гукаў;

2) вымаўленне слова супадае з яго напісаннем;

3) у слове адзін падоўжаны і адзін падвоены гук;

4) у слове 9 літар, 7 гукаў;

5) у слове ёсць санорныя гукі.

## Тэма 2
## <u>Арфаграфія</u>

### <u>2.1 Правапіс а, о, ы, э</u>***

Галосныя літары о, э пішуцца толькі пад над націскам (у тым ліку і ў словах іншамоўнага паходжання), а не пад націскам пераходзяць у а:ногі-нага, востры—вастрыць, цэгла—цагляны, трыа, Токіа, Монтавідэа.

Не падпарадкоўваюцца аканню словы са спалучэннямі ***ро, ры***: кроў --крыві—крывавы, крошка—крышыць, бровы—брыво, глотка—глытаць.

З а ў в а г а. Літара о не пад націскам пішацца ў выклічніках ого, о-го-го.

Ненаціскное э захоўваецца:

1)у пачатку слоў іншамоўнага паходжання: эпітэт, экватор, катэт, рэкорд, шэдэўр, ветэран;

2) пасля шыпячых, [р], [д], [т] і [ц]: жэтон, Жэнева, рэспубліка, рэформа, дэталь, гардэроб, дэманстрацыя, ордэн, ветэран, тэарэма, цэнтралізм, цэвіта;

3) у першай частцы складаных слоў: крэдытаздольнасць, рэдказубы, шэравокі;

4) у слове сэнс і ва ўсіх утварэннях ад гэтага слова: асэнсаваць, пераасэнсаваць.

5) ва ўласных імёнах іншамоўнага паходжання ( у канцавых спалучэннях -эль, -эр: Ландэр, Юпітэр, Гендэль, але шніцаль, камп'ютар, альма-матар, лідар, тэндар.

З а ў в а г а. У словах славянскага паходжання і ў даўно запазычаных словах з неславянскіх моў гук [э] звычайна чаргуецца з гукам [а]: літаратура, чамадан, Чарнышэўскі, латарэя, чаромха, кашалёк, а ў некаторых выпадках з гукам [ы]: брызент, дрызіна, канцылярыя, дрывотня, цырымонія і інш.

### <u>2.2 Заданні для самастойнага выканання</u>

№1.Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***а***:

1) р…данаселены;

2) поч…рк;

3) ш…птаць;

4) бухгалт…р;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5) ц…нтральны.

№2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трба пісаць літару ***а***:

1) г…ласы;
2) в…дараспыленне;
3) прынт…р;
4) р…менны;
5) ц…лафан.

№3. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***а***:

1) літ…ратура;
2) інж…нер;
3) …канамічны;
4) ш…лясцець;
5) ш…рапясчаны.

№4. Адзначце словы, у якіх падкрэслены галосны ўзнік на месцы націску о, э ў выніку змены націску:

1) шаўковы;
2) літара;
3) радзець;
4) шчаслівы;
5) стралясць.

№5. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***ы***:

1) ябл…невы;
2) гл…таць;
3) лод…р;
4) самб…;
5) др…ўляны.

№6. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***ы***:

1) др…васек;
2) гл…біня;
3) д…стрыб'ютар;
4) характ…р;
5) ш…дэўр.

№7. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***ы***:

1) дыр…жор;
2) кач…рга;
3) др…мучы;
4) д…таль;
5) ж…ніцьба.

№8. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***э***:

1) інт…лект;
2) абар…ген;
3) ж…стыкуляцыя;
4) пр…вілея;
5) зар…ва.

№9. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***э***:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) акс…суар;
2) акад…мічны;
3) п’ед…стал;
4) с…кратар;
5) адр…с.

№10. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару **э**:
1) р…дканаселены;
2) поч…рк;
3) ш…птаць;
4) бухгалт…р;
5) ц…нтральны.

№11. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) рэкорд;
2) дражаць;
3) бессардэчны;
4) пачарнець;
5) інтарвал.

№12. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) верацяно;
2) прынтэр;
3) лопух;
4) краіць (хлеб);
5) раклама.

№13. Адзначце правільна напісаныя словы (спалучэнні слоў):
1) зусім разныя;
2) цэгляны;
3) лідар;
4) жэмчужына;
5) глыбіня.

№14. Адзначце словы, у напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:
1) шэдэўр;
2) мосты;
3) характарыстыка;
4) дэлегацыя;
5) прагланучь.

№15. Адзначце словы, у напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:
1) менеджэр;
2) халады;
3) рэдкаваты;
4) дымантаж;
5) кватарант.

## <u>2.3 Правапіс е, ё, я</u>****

Літара ё пішацца толькі пад націскам: вясёлы, галлё, маё.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Чаргаванне е—я назіраецца ў першым пераднаціскным складзе слоў славянскага паходжання: землі—зямля, бедны—бядняк. У другім, трэцім і іншых і пераднаціскных складах і складанах пасля націску (у дзеясловах заўсёды) пішацца літара е: лебяда, лесніка, зеленаваты, пойдзеце, возьмеце.

У невялікай групе даўно запазычаных слоў у першым пераднаціскным складзе пішацца я: каляндар, сяржант, яфрэйтар, ялейны.

У іншамоўнай (неславянскай) лексіцы ў першым пераднацiскным складзе пішацца е: сезон, метро, семестр, секунда, легальны.

Е пішацца і ў першым пераднацiскным складзе пасля [г, к, х]: Херсон, Кетлінская, Герасім, кефір, герой.

Каранёвае я пішацца нязменна (незалежна ад месца націску): яравы, тысяча, Прыпяць.

У прыназоўніку ***без*** і адмоўі ***не*** заўсёды пішацца е: не была, не быў, без нас, без цябе.

Літара ***я*** заўсёды пішацца ў суфіксах ***-язь***, ***-ядзь*** ( у назоўніках жаночага роду) : роўнядзь, боязь, а літара ***е*** ў суфіксах ***-ец***, ***-інец*** (у суфік-
сах назоўнікаў мужчынскага роду: капец, пехацінец

З а ў в а г а. У словах семсот, семдзесят, восемсот, восемдзесят пішацца літара е.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 2.4 Заданні для самастойнага выканання

№1. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***е***:
1) пам…таць;
2) кал…ндары;
3) б…сцэнны;
4) с…нсацыя;
5) жнів…нь.

№2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***е***:
1) сув…зіст;
2) н…высокі;
3) …дловец;
4) Уздз…нскі (раён);
5) зал…мантаваць.

№3. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***е***:
1) с…мнаццаты;
2) кег..льбан;
3) Пал…сціна;
4) б..з цябе;
5) чэл…дзь.

№4. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***е***:
1) м…нтуз;
2) кубін…ц;
3) выл…чыць;
4) л…снічоўка;
5)зав…зь.

№5. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***я***:

1) перас…ленец;
2) гал…рэя;
3) вы…зджаць;
4) с…мсот;
5) г…рбарый.

№6. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***я***:
1) зв…рынец;
2) выб…гчы (на вуліцу);
3) запл…таць (косы);
4) ал…горыя;
5) дац…мна (працаваць).

№7. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***я***:
1) м…тал;
2) нап…рэдадні;
3) н…бесны;
4) пан…дзелак;
5) персп…ктыва.

№8. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***я***:
1) кал…іна;
2) зн…вага;
3) зн…важаць;
4) в…ранда;
5) с…ржант.

№9. Адзначце словы, у якіх на месцы пропускаў трэба два разы пісаць літару ***е***:
1) в…ц…р;
2) в…л…чыня;
3) пав…с…ліцца;
4) в…с…лосць;
5) м…дзв…дзяня.

№10. Адзначце словы, у якіх на месцы пропускаў трэба два разы пісаць літару ***е***:
1) (тры) ц…ц…рукі;
2) ц…ц…рук;
3) ц…ц…рка;
4) л…б…дзіны;
5) п…рп…ндыкулярны.

№11. Адзначце словы, у якіх ёсць каранёвая літара ***я***:
1) мяккі;
2) збярог;
3) пяты;
4) падмятаць;
5) святочны.

№12. Адзначце словы, у якіх падкрэсленая галосная ў першым складзе перад націскам пераходзіць у ***я***:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) забетаніраваць;
2) клён;
3) Пётр;
4) дзевяць;
5) метафарычны.

№13. Адзначце выпадкі правільнага чаргавання галосных:
1) далячынь—у далечыні;
2) сем—сямнаццаць;
3) метр—мятровы;
4) каляндар—у календары;
5) меладычны—мялодыя.

№14. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:
1) снягіры;
2) генетыка;
3) еравізацыя;
4) бяз нас;
5) бясшумны.

№15. Адзначце словы, у напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:
1) поес;
2) веелка;
3) крывёю;
4) ястраб;
5) зелянь.

## 2.5 Правапіс у/ў

Ў (нескладовае) пішацца:

1) пасля галосных у пачатку, у сярэдзіне і на канцы слова: на ўсю моц, пайсці ў лес, настаўнік, кроў. Аднак ў канцы запазычаных слоў нена-ціскное у не скарачаецца: Ландау, ток-шоу, фрау, ноу-хау;

2) пасля галосных у пачатку і ў сярэдзіне слова (ў лексіцы славянскага і неславянскага паходжання), калі ў знаходзіцца не пад націскам: ва ўніверсітэце, джоўль, саўна, але аул, саксаул;

3) пасля злучка (дэфіса) і двукосся, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосную: жанчына-ўрач, класна-ўрочны, аб'яднанне "Вясёлка" ўзнагародзілі;

4) пры гістарычным чаргаванні [л]—[ў]: да[л]а-да[ў], мы[л]а—мы[ў];

5) пры пазіцыйным чаргаванні [в]—[ў]: ла[в]а—ла[ў]ка, сло[в]а—сло[ў]ца.

У (складовае) захоўваецца ў запазычаных словах, якія заканчваюцца на -ус, -ум (канчаткі ў лацінскай мове): архіварыус, акварыум і ў пачатку ўласных імён і назваў (незалежна ад паходжання): ва Узбекістане, на Украіне, Тамара Уладзіміраўна.

## 2.6 Заданні для самастойнага выканання

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

№1. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх на месцы пропуску трэба ўставіць ў (нескладовае):

1) опі…м;
2) ска…т;
3) ка…чук;
4) новая …нія;
5) кантрольна-…ліковы.

№2. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх на месцы пропуску трэба ўставіць ў (нескладовае):

1) кла…нада;
2) у газеце”Звязда” …памінаецца;
3) Дубоўка …ладзімір;
4) Аб’яднанне “Інтэграл” …знагародзілі;
5) со…с.

№3. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх на месцы пропуску трэба ўставіць ў (нескладовае):

1) спяваў песню “Цячэ вада ў ярок” …краінскі калектыў;
2) туркменскія студэнты …ражаны;
3) бакала…р;
4) спяваць ва …нісон;
5) зноў …спомніўся.

№4. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх на месцы пропуску трэба пісаць ў (нескладовае):

1) га…птвахта;
2) ба…л;
3) па-…чарашняму;
4) Галіна …льянава;
5) натары…с.

№5. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх на месцы пропуску трэба пісаць у (складовае):

1) крык “…ра”;
2) а…торак;
3) двое…ладдзе;
4) Алата…;
5) гэта …нікальна.

№6. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх на месцы пропуску трэба пісаць у (складовае):

1) мане…ры;
2) пентха…с;
3) сусед-…збек;
4) Барна…л;
5) ла…сан.

№7. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх на месцы пропуску трэба пісаць у (складовае):

1) Ала …ладзіміраўна;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) жанчына-…дава;
3) па…метра;
4) А…доцця;
5) ліноле…м.

№8. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх на месцы пропуску трэба пісаць у (складовае):

1) над …сім светам;
2) уніз-…верх;
3) на …ральскіх гарах;
4) жылі … згодзе;
5) Вячасла….

№9. Адзначце словы (спалучэнні слоў), пры напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) тэрапеўт;
2) Аўстрыя;
3) вернік-уніят;
4) пастаянная урбанізацыя
5) клоун.

№10. Адзначце словы (спалучэнні слоў), пры напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) купіў учора;
2) вакуумная ўпакоўка;
3) палі і ўзгоркі;
4) Люблінская ўнія;
5) мададая фраў.

## 2.7 Правапіс мяккага знака. Ужыванне апострафа і раздзяляльнага мяккага знака

Літара ь (мяккі знак) ужываецца для абазначэння мяккасці зычных [з’, л’, н’, с’, дз’, ц’]:

1) на канцы слоў: верасень, медзь, карась;

2) пасля мяккага [л’] перад зычным (цвёрдым або мяккім): пальцы, гульня, столькі;

3) у сярэдзіне слова:

а) перад цвёрдымі зычнымі, калі гэтыя зычныя могуць чаргавацца з мяккімі: пісьмо, цьма (пісьме, цьме);

б) перад мяккімі зычнымі, калі апошнія могуць чаргавацца з цвёрдымі: васьмі, возьмеш (восьмы, вазьму);

Мяккі знак пішацца і ў некаторых граматычных формах:

1)перад канчаткам -мі ў назоўніках творнага склону множнага ліку: людзьмі, дзецьмі, коньмі;

2) перад суфіксам -чык, калі слова без гэтага суфікса заканчваецца на -нь: раменьчык (рэмень), каменьчык (камень);

3) у дзеясловах загаднага ладу перад -це (2-ая асоба множны лік): сянньце, сядзьце (у адзіночным ліку такія дзеясловы заканчваюцца на ь)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і перад -ся ў зваротных дзеясловах: агледзься, сустрэнься (без -ся такія дзеясловы заканчваюцца таксама на ь);

4) у назоўніках перад суфіксам -к-, калі слова ў родным склоне множнага ліку заканчваецца -нь: соценька (соцень), вішанька (вішань), чарэшанька (чарэшань);

5) перад постфіксам -сьці: хтосьці, кагосьці;

6) у прыслоўі ледзьве (ледзь);

7) у складаных лічэбніках тыпу пяцьдзясят, дзевяцьсот;

8) у суфіксах прыметнікаў -аньк, -еньк, -эньк: прыгожанькі, маленькі, старэнькі;

9) Перад суфіксам -ск- у прыметніках, утвораных ад назваў месяцаў і назоўніка восень: студзеньскі, ліпеньскі, восеньскі.

Мяккі знак не пішацца:

1) пасля мяккіх зычных перад мяккімі, калі пры змене формы слова абодва словы становяцца мяккімі ці застаюцца цвёрдымі: дзве—два, збіраць—збор, песня—песні—песнямі;

2) пры перадачы падвоеных і падоўжаных зычных: бессістэмны, ссівелы, маліннік, вяселле, жыццё;

3) перад суфіксам -ск- у прыметніках, утвораных ад на назоўнікаў на -нь, калі гэтыя назоўнікі не назвы месяцаў: Любань—любанскі, Умань—уманскі.

З а ў в а г і.

1.У беларускай мове мяккі знак ніколі не пішацца пасля н перад ш: меншы, зменшыць.

2. Мяккі знак ніколі не пішацца пасля губных б, в, м, п, ф: голуб, восем, верф.

3. Пасля ў (нескладовага) не пішацца ні мяккі знак, ні апостраф: здароўе, Іўе.

Раздзяляльны мяккі знак пішацца:

1) пасля зычных дз, з, л, н, с, ц перад е, ё, ю, я, калі яны абазначаюць 2 гукі: Марэсьеў, мадзьяр, мільён, паштальён;

2) у словах Ульяна, Касьян, лье, Ілья і ва ўсіх утварэннях ад іх.

З а ў в а г а. У слове ***булён*** раздзяляльны мяккі знак не пішацца.

Апостраф пішацца:

1) пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычны, перад у, ё, ю, я і перад націскным і: з’езд, між’ярусны, раз’юшаны, аб’інелы;

2) у сярэдзіне слова пасля зычных перад тымі самымі галоснымі: бар’ер, вераб’іны, Юр’еў;

3) у складаных словах пасля частак -двух, -трох, -чатырох: двух’ярусны, чатырох’ярусны.

З а ў в а г а. У складаных і складанаскарочаных словах на мяжы састаўных частак (у тым ліку, калі яны пішуцца праз злучок) апостраф не пішацца: цэхячэйка, дзяржюрвыдавецтва, трэд-юніёны.

## 2.8 Заданні для самастойнага выканання

№1. Адзначце словы са змякчальным мяккім знакам:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) васьмёрка;
2) восень;
3) Ільінічна;
4) станьце;
5) трыльён.

№2. Адзначце словы з раздзяляльным мяккім знакам:
1) возьме;
2) налье;
3) Касьянавіч;
4) парцьеры;
5) ледзьве.

№3. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца мяккі знак:
1) цюмен…скі;
2) пабол…шыць;
3) малакроў…е;
4) В…етнам;
5) гіл…яціна.

№4. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх на месцы пропуску пішацца мяккі знак:
1) раменьчык;
2) ал…янс;
3) аб…яднанне;
4) Паддуб…е;
5) памен…шыць удвая.

№5. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх на месцы пропуску пішацца мяккі знак:
1) суб…ект;
2) бракан…р;
3) аген…чык;
4) саф…ян;
5) прыехаць у гос…ці.

№6. Адзначце словы, у якіх мяккі знак не пішацца:
1) нос…біт;
2) кудыс…ці;
3) старажытнас…ці;
4) іл…няны;
5) с…вежы.

№7. Адзначце словы, у якіх мяккі знак не пішацца:
1) пан…сіён;
2) восем…сот;
3) шэс…цьдзясят;
4) проц…ма;
5) дастан…це.

№8. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба ставіць апостраф:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) дзет…яслі;
2) трох…ярусны;
3) з…ымправізаваць;
4) суб…ектыўны;
5) між…ірыгацыйны.

№9. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба ставіць апостраф:
1) звыш…імклівы;
2) сен…ёр;
3) мыш…як;
4) неад…емны;
5) двух…элементны.

№10. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба ставіць апостраф:
1) сям…я;
2) манпанс…е;
3) раўнапраў…е;
4) Об…ю;
5) д…ябал.

№11. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) Софья;
2) мнагаводдзе;
3) Прымор’е;
4) цьвёрды;
5) пісьменнік.

№12. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) прэмьера;
2) перамір’е;
3) снежаньскі;
4) свежасьці;
5) натхненне.

№13. Адзначце словы, пры напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:
1) астраханьскі;
2) батоньчык;
3) жменька;
4) дзьмухавец;
5) пельмені.

№14. Адзначце словы, пры напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:
1)струменчык;
2) вішанка;
3) ільдзіна;
4) сцвярджаць;
5) шмат’ёмісты.

№15. Адзначце словы, у якіх пры перакладзе на беларускую мову пішацца раздзяляльны мяккі знак:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) Соловьёв;
2) миллион;
3) Ульяновна;
4) Сырдарья;
5) гладью.

№16. Адзначце словы, у якіх пры перакладзе на беларускую мову мяккі знак не пішацца:

1) Обь
2) уменьшить;
3) черешенка;
4) резьба;
5) комсомольский.

## 2.9 Правапіс падоўжаных зычных*****

Зычныя гукі [з, ж, дз, л, н, с, ц, ш, ч, ], стаўшы ў пазіцыі паміж галоснымі, вымаўляюцца і пішуцца падоўжана. Падаўжэнне лічыцца фанетычнай з'явай. На пісьме яно перадаецца падвоеным напісаннем адпаведных літар: палоззе, падарожжа, вецце, Парэчча.

Падоўжаны гук [дз] на пісьме перадаецца спалучэннем літар ддз: суддзя, разводдзе.

З а ў в а г а. Не падаўжаюцца ў вымаўленні і не падвойваюцца на пісьме гукі [л', с', дз'] ва ўласных імёнах Ілья, Емяльян, Касьян, Ульян, Ульяна, Юльян, Юльяна, Традзьякоўскі і вытворныя ад іх.

У запазычаных словах падоўжаныя зычныя не пішуцца: група, калектыў, піца, Ала, Адэса і г.д., але: бонна, донна, манна, панна, ванна, мадонна, саванна, Ганна, Жанна, Сюзанна, Мекка.

## 2.10 Заданні для самастойнага выканання

№1. Адзначце словы, у якіх адбываецца падаўжэнне ўказаных зычных:

1) А(лл)а;
2) а(лл)егорыя;
3) гру(пп)а;
4) Жа(нн)а;
5) вясе(лл)е.

№2. Адзначце словы, у якіх адбываецца падаўжэнне ўказаных зычных:

1) то(нн)а;
2) каме(нн)е;
3) збаве(нн)е;
4) І(нн)а;
5) Ме(кк)а.

№3. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх адбываецца падаўжэнне і пішуцца падвойныя літары:

1) трыццац…ю;
2) радасц…ю;
3) нясві…жскі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) апалае лісц…е;
5) павуцін…е.

№4. Адзначце словы, у якіх адбываецца падаўжэнне і пішуцца падвойня літары:

1) праж…скі;
2) збаж…ына;
3) збож…а;
4) дзевятнаццац…ю;
5) сям…ю (творны склон лічэбніка сем).

№5. Адзначце словы, дзе няма падаўжэння і пішацца адна зычная літара:

1) двуко(с)е;
2) маладос(ц)ю;
3) Ге(н)адзій;
4) жы(ц)ё;
5) чэ(ш)скі.

№6. Адзначце словы, дзе няма падаўжэння і пішацца адна зычная літара:

1) ма(с)аж;
2) прыпе(ч)ак;
3) запе(ч)а;
4) Адэ(с)а;
5) Ната(л)я.

№7. Вусна перакладзіце словы на беларускую мову. Адзначце тыя, у якіх адбываецца падаўжэнне зычных:

1) восемнадцатью;
2) Сюзанна;
3) сказанный;
4) касса (билетная);
5) девятью.

№8. Вусна перакладзіце словы на беларускую мову. Адзначце тыя, у якіх адбываецца падаўжэнне зычных:

1) комиссия;
2) волнение;
3) полесский;
4) Полесье;
5) Илья.

№9. Адзначце правільна напісаныя словы:

1) васьмью;
2) у роспаччы;
3) шасцю;
4) Сарбонна;
5) галлё.

№10. Адзначце правільна напісаныя словы:

1) Кранаполе;
2) трынаццаццю;
3) Аксіння;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) Оббю;
5) сумессю.

## 2.11 Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах

Большасць запазычаных слоў, якія маюць спалучэнні галосных, пішуцца згодна з правіламі беларускай арфаграфіі.

1.Калі спалучэнні ***іо, йо*** вымаўляюцца як два склады, тады яны на пісьме абазначаюцца:

а) паміж зычнымі—літарамі ***іё***(***ыё***) пад націскам і ***ія***(***ыя***) не пад націскам: Ліён, аксіёма, патрыёт; патрыятызм, бібліятэка;

б) у пачатку слова—літарамі ***іо*** пад націскам і ***іа*** не пад націскам: іон, Іосіф; Іанічнае мора, Іашкар-Ала, Іаан.

2. Калі спалучэнні ***іо, йо***вымаўляюцца як адзін склад, тады на пісьме яны перадаюцца:

а) пасля галосных праз ***ё*** пад націскам і ***я*** не пад націскам раён, маёр; маянэз, раяніраванне;

б) у пачатку слова—праз ***ё***: ёгурт, ёд, ётавы.

3. Спалучэнне ***іе*** абазначаецца на пісьме літарамі ***іе***(***ые***): гігіена, кліент, арыентацыя, абітурыент.

4. Спалучэнне ***йе*** заўсёды перадаецца праз ***е*** (вымаўляецца як адзін склад): канвеер, Феербах, фае.

5. Спалучэнне ***іа*** перадаецца на пісьме літарамі ***ія***(***ыя***) незалежна ад месца націску: геніяльны, Іліяда, варыянт, матэрыял.

6. Спалучэнне ***йа*** на пісьме перадаецца:

а) пасля галосных і ў пачатку слова –праз ***я***: раяль, пляяда, ярус, яхант;

б) пасля зычных ***л***, ***с, ц*** (мяккага), ***дз*** і непрыставачных ***н*** і ***з*** –праз ***ья***, пасля астатніх зычных—праз ***'я***: мільярд, кальян, мадзьяр, альянс, мільярдэр, саф'ян.

## 2.12 Заданні для самастойнага выканання

№1. Адзначце словы, у якіх трэба ўставіць спалучэнне ***іё***:
1) акс…ма;
2) панс…н;
3) лег…н;
4) арх…лаг;
5) бібл…тэка.

№2. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх трэба ўставіць спалучэнне ***ія***:
1) пенс…нер;
2) міл…рд;
3) арганізац… свята;
4) б…графія пісьменніка;
5) цікавіцца арх…логіяй.

№3. Адзначце словы, у якіх трэба ўставіць літару ***ё***:
1) Ла…ла;
2) ра…ніраванне;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) Капыльскі ра…н;
4) ма…нэз;
5) …гурт.

№4. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) акардэён;
2) феядалізм;
3) мемарыал;
4) феерверк;
5) аўкцыён.

№5. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) дэгустацыя;
2) Нью-Ёрк;
3) метэазводка;
4) пансіанат;
5) йодаформ.

№6. Адзначце словы (спалучэнні слоў), пры напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:
1) фразіалагічны слоўнік;
2) гладзіёлус;
3) відэаканферэнцыя;
4) трыа віяланчалістаў;
5) харэаграфічнае вучылішча.

№7. Адзначце словы (спалучэнні слоў), пры напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:
1) кандыцыанер;
2) кітайскі іерогліф;
3) хрысціянін;
4) царкоўная іерархія;
5) згубіць арыянцір.

№8. Адзначце словы, пры перакладзе якіх на беларускую мову трэба пісаць літару ***я***:
1) плеяда;
2) саквояж;
3) йатираваны;
4) районный;
5) майор.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 2.13 Правапіс некаторых спалучэнняў зычных

1. Спалучэнне зычных ***дт*** на канцы слоў іншамоўнага паходжання перадаецца праз ***т***: Шміт, фарштат, Кранштат.

2. Спалучэнні зычных ***ск, ст, с'ц'*** на канцы кораня слова могуць чаргавацца з ***шч***, што і перадаецца на пісьме: воск—вашчыць, густы—гушчар, хрысціць—хрышчоны.

3. У асобных словах адбылося спрашчэнне груп зычных: гістарычныя спалучэнні ***здн***, ***згн***, ***стн***, ***снк***, ***стл***, ***рдн*** вымаўляюцца як ***зн, сн, сл, рн***, што і

адлюстроўваецца на пісьме: праязны, бразнуць, бязлітасны, ляснуць (выключэнні: вікнуць, націскны), помслівы, міласэрны.

4. У словах ***шчасце***, ***ушчуваць***, ***нішчымны***, ***пяшчота***, ***рошчына*** (параўн.: рашчыніць—расчыніць дзверы) і інш. напісанне адпавядае вымаўленню.

5. Словы ***расол***, ***ростань***, ***расольнік***, ***расаднік*** (маладыя расліны або месца, дзе яны вырошчваюцца) пішуцца з адной літарай с, але: рассаднік хваробы.

## 2.14 Заданні для самастойнага выканання

№1. Адзначце правільна напісаныя словы:

1) капусны;
2) баластны;
3) Шмідт;
4) цісмнуць;
5) маштаб.

№2. Адзначце правільна напісаныя словы:

1) бразнуць;
2) Гумбальт;
3) брушчатка;
4) хрысціцца;
5) колькастны.

№3. Адзначце правільна напісаныя словы:

1) васчыць;
2) баластны;
3) посны;
4) пясчанік;
5) абвесны.

№4. Адзначце словы, у напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) урымсціцца;
2) Рэмбрандт;
3) сардэчны;
4) капусны;
5) праяздны.

№5. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) усчуванне матуліна;
2) рашчыніць пірог;
3) бразгнуць клямкай;
4) расаднік грыпу;
5) аванпосны.

№6. Адзначце словы (спалучэнні слоў) пры напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) стаяць на ростанях;
2) дамы міласэрднасці;
3) вусны экзамен;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) майскае солнца;
5) чалавечае шчасце.

## 2.15 Прыстаўныя зычныя і галосныя гукі

У беларускай мове ёсць прыстаўныя зычныя ***в*** і ***г***.

Прыстаўное ***в*** пішацца:

1) перад о ў пачатку слова і пасля прыставак: войлачны, вобыск, вокны, возера, адворваць, але: окаць;

2) перад націскным у: павук, цівун, есавул і вытворных ад іх утварэннях: павуцінне, есавульскі;

3) перад націскной галоснай о ў словах, якія пачынаюцца з прыставак о-, об-, од-(-от), на-: вокіс, водгук, наводдаль;

4) у словах вока, востры, павук і ва ўтварэннях ад іх, а таксама ў некаторых уласных імёнах і прозвішчах: Навуменка, Ларывон, Радзівон і інш.

З а ў в а г а. Пры змене формы слова або пры ўтварэнні новага слова, калі націск пераходзіцт з ***о***, ***у*** на іншы склад, прыстаўное в не пішацца: восень—асенні, возера—азёрны, вупраж—упрэгчы, адворваць—адараць, наводдаль—аддалены.

Прыстаўное ***в*** не пішацца:

1) перад націскной о ў словах іншамоўнага паходжання, у некаторых уласных імёнах і геаграфічных назвах: ода, опера, Орша, Омск.

2) перад пачатковай літарай у ў словах іншамоўнага паходжання, геаграфічных назвах і некаторых імёнах і прозвішчах: унія, урна, (выключэнне: вустрыца), Урал, Узда, Урбановіч і інш.;

3) перад літарай у ў прыстаўках і перад у, якое развілося з в: увага, удава, уперад, упрысядкі;

4) у запазычаных словах вохра, воцат і вытворных ад іх: вохрыць, воцатнакіслы.

Прыстаўное ***г*** пішацца ў займенніках і прыслоўях гэты, гэтулькі, гэтаксама, дагэтуль, у некаторых выклічніках тыпу гэй!, го!, га! (магчыма напісанне і без г: эй!, о!, а!.

Прыстаўнымі галоснымі могуць быць ***а***, ***і***.

Прыстаўная галосная ***а*** ўжываецца ў словах аржаны, амшара (іржаны, імшара).

Прыстаўная галосная **і**ўжываецца перад зычнымі л, м, р. Перад м і ўжываецца заўсёды, незалежна ад таго на зычны ці на галосны заканчваецца папярэдняе слова: над імглой, у імгле, у імху. Перад л, р—толькі тады, калі папярэдняе слова заканчваецца на зычны: з ільготай, але па льгоце, над іржышчам, але ў ржышчы.

У сярэдзіне слова прыстаўная галосная ***і***не пішацца: налгаць, замкнуць, саржавелы.

З а ў в а г а. Прыстаўныя галосныя і зычныя не з’яўляюцца прыстаўкамі, а ўваходзяць у корань слова. Каб вызначыць прыстаўныя гукі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў слове ці не, трэба змяніць кантэкст. Пры змене кантэксту прыстаўныя знікаюць: іржавы—ржа, ілгаць—лжэ, але іспыты, Іардан.

## 2.16 Заданні для самастойнага выканання

№1. Адзначце словы, у якіх ёсць прыстаўныя галосныя або зычныя:

1) імчацца;
2) імператар;
3) наводдалек;
4) іскра;
5) ворыва.

№2. Адзначце словы, у якіх няма прыстаўных гукаў:

1) аблічча;
2) аркестр;
3) водпуск;
4) вузел;
5) імклівы.

№3. Устаўце, дзе трэба, і:

1) на …льдзіне;
2) вока…мгненна;
3) за…ржаць;
4) зёран …льняных;
5) увесь дзень …мжэла.

№4. Адзначце словы, у якіх пры перакладзе на беларускую мову пішуцца прыстаўныя гукі:

1) урожай;
2) остроносый;
3) урна;
4) Обь;
5) паутина.

№5. Адзначце словы, у якіх пры перакладзе на беларускую мову не пішуцца прыстаўныя гукі:

1) Наум;
2) Урал;
3) заострить;
4) офис;
5) ураган.

№6. Адзначце правільна напісаныя словы:

1) заушніца;
2) устрыца;
3) угаманіцца;
4) завочны;
5) востраў.

№7. Адзначце словы, пры напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) войска;
2) наоддаль;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) Ворша;
4) навобмацак;
5) вулей.

№8. Адзначце словы (спалучэнні слоў), пры напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:
1) памчацца наперад;
2) вельмі заікацца;
3) уражаны воперай;
4) заімглёная далеч;
5) куслівыя осы.

## 3. Комплекснае заданне па праверцы ведаў

### Частка А

А1. Адзначце словы, вымаўленне якіх не супадае з напісаннем:
1) галубка;
2) на рэчцы;
3) агеньчык;
4) нішчымны;
5) зжаліцца.

А2. Адзначце словы, у якіх літара ю абазначае два гукі:
1) жартуюць;
2) бюст;
3) юнак;
4) дзвюма;
5) раз'юшаны.

А3. Адзначце словы, у якіх усе зычныя глухія:
1) капуста;
2) цяжкасць;
3) сціхаюць;
4) шчасце;
5) касьба.

А4. Адзначце словы, у якіх літара н абазначае мяккі гук:
1) бензін;
2) камандзіроўка;
3) вакансія;
4) пенсія;
5) канспект.

А5. Адзначце словы, у якіх ёсць два мяккія гукі:
1) цвіль;
2) снег;
3) змена;
4) песня;
5) вакансія.

А6. Адзначце спалучэнні, у якіх прыназоўнік з вымаўляецца як гук [з']:
1) зрабілі з бярозы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) выйшлі з двара;
3) сплялі з саломы;
4) ліў з вядра;
5) пашылі з шоўку.

А7. Адзначце словы, у якіх лірары ***д*** і ***з*** адзін гук:
1) падззямелле;
2) падзяліць;
3) адзімаваць;
4) адзіны;
5) надзвычайны.

8. Адзначце назоўнікі, у аснове якіх пры ўтварэнні формы адзіночнага ліку меснага склону адбываецца чаргаванне зычных:
1) засуха;
2) агарод;
3) Алёнка;
4) агрэх (памылка, недахоп);
5) мурог.

А9. Адзначце словы, у якіх гук [в] з’яўляецца прыстаўным:
1) вобраз;
2) войска;
3) ворс;
4) вораг;
5) вольха.

А10. Адзначце словы, у якіх два галосныя гукі стаяць побач:
1) кітаец;
2) маёр;
3) статуя;
4) геаграфія;
5) архіварыус.

А11.Адзначце словы (спалучэнні слоў), дзе сустракаецца толькі гук [і]:
1) сціх;
2) смех і грэх;
3) у Іры;
4) аб’інелы;
5) яна і ён.

А12. Адзначце словы (спалучэнні слоў), у якіх літара і вымаўляецца як [й’і]:
1) у гаі;
2) паслаў ім;
3) пад іглііцай;
4) іхні;
5) цацкі і цукеркі.

А13. Адзначце словы, у якіх гук [с] з’яўляецца цвёрдым:
1) сліва;
2) скіба;
3) схільны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) секчы;
5) смех.

A14. Адзначце словы, у якіх два звонкія зычныя знаходзяцца побач:
1) рукзак;
2) збіць;
3) задача;
4) скіба;
5) футбол.

A15. Адзначце правільныя сцверджанні:
1) гукаў [е, ё, ю, я] няма;
2) фанетыка вывучае гукі і спалучэнні гукаў;
3) у слове ***касьба*** два глухія зычныя гукі;
4) у беларускай мове няма няпарных глухіх зычных;
5) і ў беларускай і ў рускай мовах гук [в] з'яўляецца парным па глухасці/звонкасці.

A16. Адзначце правільныя транскрыпцыі слоў:
1) [над ілбом];
2) [вучышс'я];
3) [з' й'агорам];
4) [с хаты];
5) [ск'ептык].

A17. Адзначце характарыстыкі, якія адпавядаюць слову ***свіцязьскі***:
1) у слове 10 літар і 9 гукаў;
2) у слове 3 мяккія зычныя;
3) у слове ёсць зычныя парныя па глухасці/звонкасці;
4) у слове адбываецца падаўжэнне зычных;
5) у слове ёсць няпарны звонкі зычны.

A18. Адзначце словы, у якіх пры перакладзе на беларускую мову пішуцца падоўжаныя зычныя:
1) заколдованный;
2) ночью;
3) семью (часами);
4) ванна;
5) режиссёр.

A19. Адзначце словы, у якіх на месцы пропускаў пішацца літара ***а***:
1) ч…рніцы;
2) р…цэпт;
3) ч…снок;
4) ц…нтральны;
5) ч…бор.

A20. Адзначце словы, у якіх на месцы пропускаў пішацца літара ***е***:
1) л…бедзь;
2) дз…вяты;
3) ве…лка;
4) г…раізм;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5) н… быў.

A21. Адзначце словы, напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) ефрэйтар;
2) замець (снежная);
3) пойдзяце;
4) кефір;
5) лесьнічыха.

A22.Адзначце правільна напісаныя словы:

1) гусчар;
2) радасны;
3) лётчык;
4) міласэрны;
5) рашчасаць.

A23. Адзначце словы, у напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) усчуваць;
2) карыстны;
3) праязны;
4) фарштадт;
5) кантрасны.

A24. Адзначце словы спалучэнні слоў), у якіх на месцы пропускаў пішацца літара ***у***(складовае):

1) верш “Мая Радзіма” ...спомніўся;
2) акварэ…м;
3) цікаве ток-шо…;
4) кона…ка;
5) каля горада …зда.

A25. Адзначце словы, у напісанні якіх дапушчаны памылкі:

1) глатаць;
2) кампэютэр;
3) маразы;
4) тысеча;
5) рэгіён.

A26. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара **е**:

1) клі…нтура;
2) ажы…таж;
3) гені…льны;
4) кі…скёр;
5) кары…с.

A27. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***ь***:

1) смаргон…скі;
2) Сібір…;
3) трыл…ён;
4) аб…ект;
5) слабен…кі.

A28. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца апостраф:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) кар…ер;
2) бул…ён;
3) бяз…ядзерны;
4) двух…ярусны;
5) Іл…я.

А29. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) рошчына;
2) асвальт;
3) пэндзаль;
4) дыспеччар;
5) скрупулёзны.

А30. Адзначце няправільныя сцверджанні:
1) у слове іспыты ёсць прыстаўны галосны;
2) у слове ***экзамен*** два звонкія гукі стаяць побач;
3) у слове ***сціхаць*** напісанне супадае з вымаўленнем;
4) у слове ***падаконнік*** ёсць марфалагічнае падваенне зычных;
5) у спалучэнні ***над івай***літара і абазначае гук [ы].

## Частка В

В1. Выпішыце слова, у якім адбываецца асіміляцыя зычнага гука па мяккасці:
1) сківіца;
2) усмешка;
3) бензін;
4) згінуць;
5) схіліць.

В2. Запішыце пададзенае ў транскрыпцыі слова ў адпаведнасці з афаграфічнымі нормамі: [кагос’ц’і].

В3. Знайдзіце і выпішыце слова, у якім не пішацца апостраф:
1) суб…ект;
2) шмат…ярусны;
3) дзрж…юрвыдавецтва;
4) надвро…е;
5) інтэрв…ю.

В4.Знайдзіце слова, пры перакладзе якога з рускай мовы на беларускую захоўваюцца падоўжаныя зычныя. Запішыце гэта слова па-беларуску.
1) аллея;
2) тонна;
3) примадонна;
4) шасси;
5) Алла.

В5. Знайдзіце і выпішыце словы, у якім супадае колькасць галосных і зычных гукаў:
1) маёр;
2) кітаец;
3) яліначка;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) мыццё;
5) Ягор.

В6. Знайдзіце і выпішыце слова, у якім ёсць прыстаўны галосны:
1) на льнішчы;
2) без …льготаў;
3) маладая …львіца;
4) на …ржышчы;
5) за…мглёны.

В7. Запішыце лічбай нумар слова, у якім на месцы пропуску пішацца літара ***с***:
1) ні…чымны;
2) на…чыпаць;
3) пабоі…ча;
4) лу…чыць;
5) ра…шпіліць.

В8. Знайдзіце слова, у напісанні якога дапушчана арфаграфічная памылка. Запішыце гэта слова правільна.
1) рэгіён;
2) арыентацыя;
3) рэакцыя;
4) меліаратар;
5) біятлон.

9. Знайдзіце слова, напісанае правільна. Запішыце яго.
1) мяртвяк;
2) счыпцы;
3) шэршынь;
4) аудыенцыя;
5) дыслакацыя.

10. Адзначце, колькі разоў сустракаецца гук [ш] у прапанаваным сказе:
Горш, калі баішся: і ліха не мінеш і надрыжышся.
1) 1;
2) 2;
3) 3;
4) 4;
5) 5.

---

* У пачатку слова літара і абазначае два гукі толькі тады, калі знаходзіцца ў пазіцыі пад націскам: ім—[й’і]м, Іра—[й’і] ра. Аднак у запазычаных словах літара і пад націскам абазначае адзін гук [і]: Індыя—[і]ндыя, імпарт—[і]мпарт.
** У школьнай праграме класіфікацыя зычных па прыметах месца ўтварэння і спосаб утварэння не вывучаюцца, таму і ў нашым дапаможніку яны апушчаны.
*** Правапіс галосных о, а, э ў складаных словах пададзены ў тэме “Словаўтварэнне і арфаграфія”.
**** Правапіс галосных е, ё, я ў складаных словах пададзены ў тэме “Словаўтварэнне і арфаграфія”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***** Ад фанетычнага падаўжэння трэба адрозніваць марфалагічнае падваенне зычных. Падваенне сустракаецца на стыку марфем. Напрыклад, прыстаўкі і кораня: бясслоўны, аддаць; кораня і суфікса: незаконны, маліннік. Падвойвацца могуць усе зычныя беларускага алфавіта.

---

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# *Склад слова, словаўтварэнне і арфаграфія*

## Тэма 1
## Значымыя часткі слова (марфемы)

### 1.1 Аснова і канчатак у слове

Большасць слоў у беларускай мове падзяляюцца на структурныя часткі, або марфемы.Да марфем адносяцца корань, прыстаўка, суфікс, канчатак, злучальныя галосныя ў складаных словах.Напрыклад: *гар-а—гар-ыст---уз-гор-ак;слов-а—слоў-ц-а—слоў-н-ік-- слов-а-ў-жнне.*Марфемы выражаюць лексічнае або граматычнае значэнне слова.Не падзяляюцца на марфемы невытворныя службовыя часціны мовы: *на, пад, але, нават,аж.*

У словах, якія змяняюць сваю форму, перш за ўсё выдзяляюць дзве асноўныя часткі—зменная і нязменная: *лес—лес-у—за лес-ам—у лес-е;*

*родн-ы—родн-ага—родн-аму—родн-ым.*Нязменная частка слова выражае канкрэтнае лексічнае значэнне і называецца асновай:*збажын-а—збажыны—збажын-е –збажын-ой—(у) збажын-е.*Аснова—частка слова без канчатка.

Канчатак—зменная частка слова , яна служыць для сувязі слоў у сказе або словазлучэнні і ўтварае граматычную форму слова.Напрыклад: *Ма-**ё** найбольша-**е**багацц-**е**– у скарб-**ах**родн-**ае**зямл-**і***. (Я.Брыль).Канчаткі не выражаюць лексічнага значэння слоў.Яны служаць для сувязі слоў (*багацце—ма**ё**,найбольш**ае***; *зямлі—родн**ае***; *у скарбах—зямл**і**)* і ўтвараюць формы слоў (формы роду, ліку, склону)

Інфінітыў (пачатковая форма дзеяслова), прыслоўе, дзеепрыслоўі канчаткаў не маюць, нарыклад *бег**чы**, ес**ці**, да**ць**;холадн**а**, па-летн**яму**, добр**а**; ссек**шы**, ходз**ячы**, сп**лючы** (*выдзеленыя часткі—суфіксы).У назоўніках *дэпо, метро, пано* ёсць толькі корань.Зменныя словы ў некаторых формах могуць мець нулявы канчатак:*дзень, край, печ,сенажаць, рэчак, армій.*Нулявы канчатак таксама з’яўляецца паказчыкам граматычнай формы (*сын, конь, радасць, ноч*—назоўнікі адзіночнага ліку назоўнага склону;*рэчак,армій, арганізацый*—назоўнікі роднага склону множнага ліку).Нулявы канчатак лёгка ўзнаўляецца пры змене формы слова.Напрыклад, у словах *сын, дом* канчатак нулявы, бо варта змяніць форму склону і ў гэтых словах З’яўляецца матэрыяльна выражаныя канчаткі:*сын-**а**,сын-**ам***; у дзеясловах прошлага часу *чытаў,капаў*таксама нулявы канчатак, бо варта змяніць род гэтых дзеясловаў і таксама з’яўляецца матэрыяльна выражаны канчатак: *чытал-**а**,капал-***а**.

У зваротных дзеясловах і дзеепрыслоўях часціца *–ся(-цца,ца)*—своеасаблівая марфема, якая знаходзіцца ў слове пасля канчатка або пасля формаўтваральнага суфікса:*радавац-ца, радую-ся, радуеш-ся,радуе-цца.* Гэта марфема знаходзіцца ў самым канцы слова, і называюць яе постфіксам.

Сустракаюцца цяжкасці пры вызначэнні асновы ў тых выпадках, калі апошні гук асновы і канчатак абазначаны адной ётавай літарай—*я ,ю, е, ё, і.* У словах тыпу *надвор’е, узмор’е, кап’ё, сям’я, армія, экспедыцыя, лінія* аснова заканчваецца на [*й*]:*надворй-э, узморй-э, капй-о, сямй-а, армій-а, экспедыцый-а. ліній-а.*У родным склоне множнага ліку: армій, экспедыцый, ліній (нулявы канчатак).

Паводле структуры асновы бываюць вытворныя і невытврныя.Невытворная аснова супадае з коранем слова: *лес, стол, гай, мор-а ,сін-і, піш-у, рад-ы.*У вытворную аснову ўваходзяць, апрача кораня, іншыя марфемы: *мар-ск-і, лет-н-і, дабр-ат-а, рад-асць.*

У вытворнай аснове, апрача кораня, кораня могуць быць:

1) прыстаўка: *пры-няс-е, за-столл-е, над-піс, пра-кос*;2) суфікс:*горад-скі,прастор-н-ы, вуч-об-а*;3) прыстаўка і суфікс: *бяз-меж-н-ы, за-мор-ск-і, бяз-ветраны*;4) другі корань і злучальная галосная: *сен-а-кос, ліст-а пад, круг-а-гляд,земл-я-мер*; 5) прыстаўка, суфікс, другі корань, злучальная галосная:*перш-а-курс-нік, торф-а-рас-прац-оў-к-і*; *слов-а-з-мян-енн-е, паўн-а-вод-н-ы.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 1.2Корань і яго варыянты

Калі параўнаць асновы некалькіх слоў, блізкіх паводле значэння, можна заўважыць у іх агульную непадзельную частку:*на-вук-а—вуч-ы-ць—вуч-ы-ц-ца—вуч-об-а—вуч-ань—на-вук-ов-ы—на-вуч-а-льн-ы.* У гэтых словах ёсць агульная непадзельная частка-*вук(-вуч)* і розныя часткі асновы –суфіксы, прыстаўкі, з дапамогай якіх удакладняецца, канкрэтызуецца сэнс слоў.

Непадзельная частка роднасных слоў, якая выражае іх лексічнае значэ нне, называецца коранем: *прац-ав-а-ць—прац-в-іт-ы—прац-аў-н-ік—прац-а-здольны—прац-а- дзень.*Корань *–прац-* паказвае наагульнае лексічнае зна чэнне гэтых слоў: усё, звязанае з паняццем "праца". А канкрэтнае лексічнае значэнне кожнага з гэтых слоў выражаецца ў аснове.

Каб вызначыць корань слова, трэба падабраць роднасныя словы: *рак-а рач-н-ы—рач-н-ік—рэч-ышч-а—рач-улк-а—за-рэч-н-ы—за-рэчч-а.*

У некаторых словах гукавы склад кораня і яго літарнае абазначэнне не супадаюць.Гэта бывае ў тых выпадках, калі ётавыя літары *і, я, е, ё, ю* абазначаюць два гукі, адзін з якіх адносіцца да кораня, другі— да наступнай марфемы (сфікса, канчатка). Патрэбна правільна вызначаць корань у такіх словах. Напрыклад, у роднасных словах *край, краіна, ускраіна, бяскрайні* корань заканчваецца на й—*край* (у словах *край-ін-а, ус-край-ін-а* і абазначае два гукі:[й]+ [і].На *й* заканчваецца корань і ў такіх словах: *вырай (у вырай-ï)*; *асвоіць (а-свой-і-ць)—свае (свай-э)*; *май—у маі* (*у май-ï*); *чай—чаёк* (*чай-ок*)—*у чаі* (*у чай-ï*).

Пры змяненні і ўтварэнні слоў у каранях часта адбываецца чаргаванне гукаў: лу**г**—лу**ж**ок—на лу**з**е, дз**е**ці—дз**і**ця, кні**г**а—кні**ж**кі.Чаргавацца могуць як зычныя, так і галосныя гукі.Найбольш пашыраны наступныя чаргаванні.

Ч а р г а в а н н і г а л о с н ы х г у к а ў

[о]—[а]: в**о**зера—**а**зёрны, г**о**рад—г**а**рады

[э]—[а]:рэкі—р**а**ка,цэны—ц**а**на

[э]—[]і:кв**е**тка—кв**і**тнець, св**е**т—св**і**танак

[э]—[а]—[о]:н**е**сці—н**а**сіць—н**о**сіць, л**е**гчы—л**а**жыцца—л**о**гава

[о]—[у]—[ы]:с**о**хнуць—с**у**хі—зас**ы**хаць

[о]—[і]—[э]—[а]:зб**о**р—зб**і**раць—выб**е**ру—заб**я**ру

[о]—нуль гука:с**о**н-сны, зб**о**р—збіраць

[э]—нуль гука (бегласць галосных) : дз**е**нь—дні

Ч а р г а в а н н і з ы ч н ы х г у к а ў

[г]—[з], [ж]: на**г**а—на**з**е, но**ж**ачка

[х]—[с], [ш]: стра**х**а—стра**с**е, стрэ**ш**ка

[к]—[ц], [ч]: ра**к**а—ра**ц**э, рэ**ч**ка

[з]—[ж]: вя**з**аць—вя**ж**у

[с]—[ш]: пі**с**аць—пі**ш**у, ка**с**іць—ка**ш**у

[д]—[дз]—[дж]: ха**д**а—ха**дз**іць—ха**дж**у

[т]—[ч]—[ц]: све**т**—свя**ч**у—свя**ц**іць

[ст]—[шч]: ро**ст**—выро**шч**ваць, мо**ст**—намо**шч**аны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

[ск]—[шч]: пала**ск**аць—пала**шч**у, пло**ск**і—пло**шч**а
[б]—[бл], [п]—[пл]: лю**б**іць—лю**бл**ю, сы**п**аць—сы**пл**ю
[м]—мл], [в]—[ўл]: кар**м**іць—кар**мл**ю, лавіць—ла**ўл**ю

Адзінства кораня ў такіх выпадках не парушаецца, бо гэта або роднас ныя паміж сабой словы, якія маюць агульнае ў значэнні, або формы таго самага слова.

Сустракаюцца выпадкі, калі карані бываюць аднолькавыя або падоб-ныя сваім гукавым складам, але маюць зусім рознае значэнне, параўн.:*па-****вод****-ка* і *пра-****вод****-ка*. У такіх выпадках гавораць пра аманімію каранёў. Кара ні-амонімы супадаюць гучаннем і напісаннем, але адрозніваюцца лексічным значэннем і паходжаннем, а таму ўтвараюць розныя гнёзды роднасных слоў: ***кас****а—****кас****іць—****кась****ба—****кас****авіца—****кас****ец—пракос—сена****кос—кас****ілка,* ***кас****ы—пера****кос—кос****а—****кас****авокі—пера****кош****аны—пера****кос****іна*; ***нага****—пад****нож****ны—пад****нож****жа—пад****нож****ка,* ***нож—нож****ык—****нaж****ніцы*.

Памятаць трэба і пра тое, што формы аднаго і таго ж слова гнёздаў роднасных слоў не ўтвараюць: *нага—нагой—назе—ногі, пісаць—пісаў—пісала—пісалі*.

### 1.3Прыстаўка (прэфікс), суфікс, постфікс

Прыстаўка (прэфікс) частка асновы, якая стаіць перад коранем і слу-жыць для ўтварэння новых слоў або форм слова: ***пі****саць—* ***на****пісаць—* ***адпі****саць—****пера****пісаць*; *хутчэй—****най****хутчэй.*
Суфікс—частка асновы, якая стаіць пасля кораня і служыць для утва рэння новых слоў або форм слова: *лес—ляс****ок****—ляс****н****ы—ляс****нічы****—лес****ні*** **чоўк***а*.

Прыстаўкі і суфіксы бываюць словаўтваральныя і формаўтваральныя. Формаўтваральныя прыстаўкі і суфіксы служаць для ўтварэння новай фор мы слова,лексічнае значэнне пры гэтым не змяняецца.Да формаўтваральных прыставак і суфіксаў можна аднесці:

1) памяншальна-ласкальныя і павелічальныя суфіксы назоўнікаў і прыметнікаў: *стол****ік****, ключ****ык****, сын****очак****, малень****кі****, высач****эзны****, дам****ішча***;
2) прыстаўкі і суфіксы для ўтварэння форм ступеней прыметнікаў і прыслоўяў: высокі--*вы****шэйшы****—****най****вышэйшы,добры—леп****шы****--****най****лепшы*;*высока—вы****шэй****—****най****вышэй, добра—леп****ш****—****най****лепш*;
3) суфіксы інфінітыва дзеяслова: *бег****чы****, ес****ці****, да****ць***;
4) суфіксы –л-, -ў-, якія служаць для ўтварэння форм прошлага часу: *каза****ў****—казала, чыта****ў****—чытала*;
5) суфіксы дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў (паколькі гэта асобыя формы дзеясловаў): *прачыт****ан****ы* (ад прачытаць), *аслабл****ен****ы* (ад аслабіць); *ссек****шы*** (ад ссячы), *сагну****ўшы****ся* (ад сагнуцца), *ходз****ячы***(ад хадзіць), спл**ючы** (ад спаць).

З дапамогай словаўтваральных прыставак і суфіксаў утвараюцца новыя словы, г. зн. словы з новым лексічным значэннем: *вечар—вечар****овы****—*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*вечарэць—**адвячорак**—вечар**ынка**—**надвячорак**, дзед—**пра**дзед, край—**бяс**крайні*.

Пры размежаванні афіксаў на формаўтваральныя і словаўтваральныя трэба памятаць, што суфіксы, пры дапамозе якіх ад дзеясловаў утвараюцца дзепрыметнікі і дзеепрыслоўі, з'яўляюцца формаўтваральнымі, таму дзеепрыметнікі і дзеепрыслоўі не самастойныя часціны мовы, а асобыя формы дзеясловаў.Неабходна памятаць, што калі дзеяслоў, ад якога ўтвараецца дзеепрыметнік, заканчваецца на *–іць, -ыць або –ці*, то ва ўтвораным дзеепрыметніку—суфікс *–ен-* або *–ан-*: *акрыліць—акрыл-ен-ы*, *раструшчыць—раструшч-ан-ы* , *узнесці—уз-нес-ен-ы*.У астатніх выпадках у дзеепрыметніках выдзяляюць два суфіксы: *вытаптаць—вытапт-а-н-ы*, *пасінець—пасін-е-л-ы*.

Постфікс—значымая частка слова, якая ўжываецца пасля канчатка ці формаўтваральнага суфікса і служыць для новых слоў і формаў слоў: *вітаю-ся, чытае—чытае-цца, хто-небудзь, каго-сьці*.

## 1.4Заданні для самастойнага выканання

№1. Адзначце словы з невытворнымі асновамі:
1) затвор;
2) напрамак;
3) нарыс;
4) назва;
5) нажніцы.

№2. Адзначце словы з вытворнымі асновамі:
1) фармальны;
2) невад;
3) абруч;
4) работа;
5) сямёра.

№3. Адзначце прыклады з памылковым вызначэннем асноў:
1) нашчэнт (невытворная);
2) вясёлка (вытворная);
3) ручка (чарнільная) (вытворная);
4) летась (вытворная);
5) кропля (вытворная).

№4. Адзначце прыклады з правільным вызначэннем асноў:
1) вясна (вытворная);
2) сяўба (вытворная);
3) ножка (дзіцяці) (вытворная);
4) прырода (невытворная);
5) нашэнне (невытворная).

№5. Адзначце словы, якія маюць канчатак:
1) пяцёра;
2) цёпла;
3) паехаць;
4) плакса;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5) бацька.

№6. Адзначце словы, якія не маюць канчатка:

1) БелТА;
2) нахмурыцца;
3) косячы (траву);
4) пяцьсот;
5) твайму.

№7. Адзначце словы з нулявым канчаткам:

1) восем;
2) памыўся;
3) па-нашаму;
4) пано;
5) носьбіт.

№8. Адзначце словы, у якіх выдзеленыя марфемы—канчаткі:

1) гадава**ў**;
2) умов**а**;
3) вітае**цца**;
4) любу**емся**;
5) планав**а**.

№9. Адзначце зменныя формы дзеясловаў:

1) аформіўшыся;
2) заспяваю;
3) наведаны (музей);
4) даклейваць;
5) верыў.

№10. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя маюць канчаткі:

1) *бацькаў* матацыкл;
2) няма трох *Васяў*;
3) адкрыццё *судоў*;
4) пагналі *кароў*;
5) гасцінная *свякроў*.

№11. Адзначце словы, у якіх корань складаецца з трох гукаў:

1) краіна;
2) хімія;
3) расчоска;
4) дагульваць;
5) праяўленне.

№12. Адначце словы, у якіх літарны і гукавы склады не супадаюць:

1) вулічны;
2) сталічны;
3) ад’язджаць;
4) з’яўленне.
5) аб’інелы

№13. Адзначце словы , у якіх зліты гукі кораня з іншымі марфемамі:

1) хвоя;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) сузор’е;
3) навеяны;
4) з’яўленне;
5) зроблены.

№14. Адзначце рады аднакаранёвых слоў:
1) груз, пагрузка, выгружаны;
2) вага, узважыць, вагон;
3) рабіў, рабіла, рабілі;
4) водны, воднага, водным;
5) рачны, рэчанька, прырэчны.

№15. Адзначце аднакаранёвыя словы да слова <u>*адважны*</u>:
1) адважыць;
2) адважнасць;
3) адважыцца;
4) наважыцца;
5) зважыць.

№16. Адзначце роднасныя словы  да слова <u>*вада*</u>:
1) вадзяны;
2) праводка;
3) вадкасць;
4) паводка;
5) водны.

№17. Адзначце словы з аманімічнымі каранямі:
1) нос—пераноссе;
2) насаты—насіцца;
3) пераносіца—занос (снежны);
4) выпрагчы—прага;
5) рэчка—зарэчны.

№18. Адзначце словы, у якіх выдзеленыя марфемы—суфіксы:
1) нясе**ш**;
2) ляце**ў**;
3) звечар**а**;
4) стаміл**а**ся;
5) магутн**асць**.

№19. Адзначце словы, якія ў сваім саставе маюць прыстаўку і суфікс (суфіксы):
1) жыватворны;
2) знізу;
3) бязмерны,
4) зніклы,
5) абаротны.

№20. Адзначце словы, у якіх ёсць суфікс **–к-**:
1) кніжка;
2) вадкасць;
3) блізкі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) дзядзька;
5) шапка.

№21. Адзначце словы, у якіх суфікса **–к-** няма:
1) гронка;
2) лыжка;
3) касілка;
4) шпарка;
5) звычка.

№22. Адзначце словы, якія маюць чатыры суфіксы:
1) чарнічнік,
2) загазаванасць;
3) барацьбіт;
4) двайнік,
5) двайняткі.

№23. Адзначце словы, якія маюць дзве прыстаўкі:
1) недасягальны;
2) пазрываць;
3) абамлелы;
4) пазакласны;
5) незаняты.

№24. Адзначце словы з наступнай марфемнай будовай:прыстаўка+корань +суфікс+суфікс+канчатак:
1) засмучанасць;
2) наведванне;
3) сустракаў;
4) зрыжэлы;
5) памаленьку.

№25. Адзначце словы толькі з формаўтваральнымі суфіксамі:
1) здзірванелы;
2) садовы;
3) есці;
4) разагнуць;
5) гарадскі.

№26. Адзначце словы, структура якіх адпавядае схеме: прыстаўка+корань+ суфікс:
1) заводскі;
2) небакрай;
3) надоўга;
4) асіннік;
5) замнога.

№27. Адзначце словы,якія правільна падзелены на марфемы:
1) пад-акон-нік;
2) бярэз-нік;
3) завоч-нік;
4) смя-ш-ы-ць;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5) саладз-іць (інфінітыў).

№28. Адзначце словы з постфіксам –ца:

1) купаецца;
2) высіцца (3-я асоба, цяпер. час, адз., адз.лік);
3) узвышацца;
4) павялічваюцца;
5) гартуецца.

№29. Адзначце прыметнікі, у аснове якіх пры ўтварэнні формы вышэйшай ступені адбываецца чаргаванне зычных:

1) мудры;
2) мяккі;
3) блізкі;
4) сіні;
5) густы.

№30. Адзначце дзеепрыметнікі з суфіксам –**н**-:

1) скошаны;
2) прачытаны;
3) накіраваны;
4) пабудаваны;
5) абуджаны

№31.Адзначце дзепрыметнікі з суфіксам –**ан**-:

1) вычасаны;
2) заложаны;
3) спілаваны;
4) упрыгожаны;
5) змайстраваны.

## Тэма 2. Словаўтварэнне ў беларускай мове

### 2.1Спосабы словаўтварэння

У словаўтварэнні цэнтральным з’яўляецца паняцце словаўтваральнай вытворнасці, або матывавававанасці. Згодна з гэтым паняццем усе словы ў мове падзяляюцца на невытворныя (або нематываваныя) і вытворныя (матываваныя).Таму трэба адрозніваць паняцці “вытворныя і невытворныя словы” і “вытворныя і невытворныя асновы”. Часам вытворнае слова можа мець невытворную аснову. Напрыклад, слова *бег* з’яўляецца вытворным, бо ўтварылася ад бегаць (бяссуфіксны спосаб) , аднак мае невытворную аснову, бо складаецца з толькі з кораня.

Пры словаўтварэнні трэба памятаць, што кожнае наступнае слова ў словаўтваральным ланцужку мае “найвышэйшы матываваны пункт адліку”, гэта значыць слова *прыгарад* утвараецца ад слова *горад*, а *прыгарадны* ад *прыгарад*, слова *выпраменванне* ад *выпраменьваць* (пры дапамозе суфікса *–нн-*), слова *ўраджай* ад *урадзіць* (пры дапамозе суфікса *(-ай-)* і г.д.

Усе спосабы ўтварэння слоў у беларускай мове падзяляюцца на марфалагічныя (марфемныя) і немарфалагічныя (немарфемныя).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сярод марфалагічных (марфемных) спосабаў можна вылучыць наступныя:

1) суфіксальны спосаб : *восень—восеньскі, горад—гарадскі, поле—палявы, чытаць—чытач;*
2) прыставачны спосаб: *тэрміновы—датэр-міновы, пісаць—напісаць, адпісаць, падпісаць*;
3) прыставачна-суфіксальны: *бяроза—падбярозавік, акно—падаконнік, лес—узлесак, гара—узгорак, свой—засвоіць , стол—настольнік*;
4) без суфіксаў і прыставак (бязафіксны спосаб): *ціхі—ціш, глыбокі—глыб,паляцець—палёт, запісаць—запіс, падзякаваць—падзяка*;
5) складанне (асноваскладанне, словаскладанне, асноваслоўаскладане) : *саракагоддзе, доўгачаканы, вогнеўстойлівы.*Спосаб складан ня мае шэраг разнавіднасцяў, да якіх адносіцца і абрэвіяцыя (складанаскарочаныя словы).

Да немарфалагічных (немарфемных ) спосабаў словаўтварэння варта аднесці наступныя:

1) пераход слоў з адной часціны мовы ў другую, параўн.:*Рабочы* дзень пачаўся ў 8 гадзін і *Рабочы* прыйшоў на завод (прыметнік перайшоў у назоўнік); *ранены* (салдат) і прывезлі *раненых* ( дзеепрыметнік перайшоў у назоўнік);
2) пераасэнсаванне значэння слова (семантычны), параўн.: *ручка* (дзіцяці) і *ручка* (для пісьма); *ножка* (дзіцяці) і *ножка* (крэсла).

Варта зазначыць, што ў спалучэннях ручка (для пісьма) і ножка (крэсла) асновы з'яўляюцца невытворнымі.

## 2.2Заданні для самастойнага выканання

№1. Адзначце вытворныя словы:

1) купацца;
2) пераезд;
3) дом;
4) штапель;
5) спрынт.

№2. Адзначце невытворныя словы:

1) шум;
2) сховы;
3) ісці;
4) абрус;
5) надзем'е.

№3. Адзначце вытворныя словы з вытворнымі асновамі:

1) намол (кавы);
2) напамін;
3) прадукт;
4) шум;
5) недарэка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

№4. Адзначце вытворныя словы з невытворнымі асновамі:
1) адмова;
2) проба;
3) уміг;
4) п'яўка;
5) партфель.

№5. Адзначце словы, якія непасрэдна ўтварыліся ад слова "зіма":
1) па-зімоваму;
2) зімоўе;
3) зазімак;
4) зімна;
5) зімаванне.

№6. Адзначце прыклады, у якіх правільна размешчаны словы ад утваральнага да вытворнага:
1) снегавы—снегавік;
2) заснежаны—заснежыць;
3) снег—снягурка;
4) снег—заснежыць;
5) снежка—снежны.

№7. Адзначце прыклады, у якіх няправільна размешчаны словы ад утваральнага да вытворнага:
1) зямля—зямлянка;
2) зямля—земляны;
3) зямля—зямляк;
4) зямля—зямлячка;
5) зямляк—зямлячка.

№8. Адзначце прыклады, дзе правільна пададзены словаўтваральны ланцужок:
1) цешыць—уцешыць—уцешна;
2) лес—лясны—ляснік—лясніцтва;
3) праца—працаваць—распрацаваць—распрацаванасць—нераспрацаванасць;
4) актыў—актыўны—актыўнасць—актыўнічаць;
5) рабіць—зрабіць—зроблены.

№9. Адзначце словы, утвораныя суфіксальным спосабам:
1) абгон;
2) недасаліць;
3) імгла;
4) замнога;
5) прыбліжэнне.

№10. Адзначце словы, утвораныя суфіксальным спосабам:
1) бульбакапалка;
2) даверху;
3) мінскі;
4) горача;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5) кудысьці.

№11. Адзначце словы, якія ўтвораны пруставачна-суфіксальным спосабам:

1) па-людску;
2) запісаць;
3) дамовіцца;
4) улева;
5) дамовіцца.

№12. Адзначце словы, утвораныя складана-суфіксальным спосабам:

1) двухрадкоўе;
2) шматтыражка;
3) першакурснік;
4) малаверагодны;
5) патроіць.

№13. Адзначце словы, якія ўтварыліся бяссуфіксным спосабам:

1) пералёт;
2) перазімаваць;
3) непрыемна;
4) сушылка;
5) ад'езд.

№14. Адзначце словы,якія ўтвораны постфіксальным спосабам:

1) узмацняцца;
2) дапрыгацца;
3) даразумецца;
4) дакрычацца;
5) купацца.

№15. Адзначце абрэвіятуры жаночага роду:

1) СНД;
2) ЦУМ;
3) ЛіМ;
4) БАМ;
5) ААН.

№16.Адзначце абрэвіятуры мужчынскага роду:

1) лясгас;
2) педуніверсітэт;
3) БРСМ;
4) сельгасакадэмія;
5) педустанова.

№17. Адзначце гукавыя абрэвіятуры:

1) ЛіМ;
2) БДУ;
3) БНТУ;
4) СССР;
5) БАТУ.

№18. Адзначце літарныя абрэвіятуры:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) БДПУ (імя М.Танка);
2) МКАД;
3) СНД;
4) Бел ТА;
5) ЦУМ.

№19. Адзначце словы, спосаб утварэння якіх вызначаны правільна:
1) Загор’е—прыставачны;
2) сваяк—бяссуфіксны;
3) міжброўе—прыставачна-суфіксальны;
4) прадзед—прыставачны;
5) ускапаны—прыставачны.

№20. Адзначце словы, спосаб утварэння якіх вызначаны няправільна:
1) пасінелы—суфіксальны;
2) пад’езд—прыставачны;
3) узмор’е—прыставачны;
4) знішчэнне—прыставачна-суфіксальны;
5) лесапаркавы---складана-суфіксальны.

## Тэма 3

### 3.1.Правапіс прыставак

1. Прыстаўкі *ад-*, *над-*, *пад-*, *перад-*, *аб-* пішуцца нязменна і перад звонкімі зычнымі і перад глухімі: *падняць, падказаць, адрэзаць, адкапаць, абгаварыць, абхадзіць, надліць*.

2. Прыстаўкі *з-*, *уз-*, раз-, *без-* (*бяс-*) пішуцца перад галоснымі і звонмі зычнымі з літарай *з* перад глухімі—з літарай *с*: *злесці, спісаць, узнесці, ускласці, раздаць, бездакорны, бясшумны*.

Калі прыстаўка заканчваецца на *с*, а корань пачынаецца з *ч*, спалучэнне *сч* на пісьме перадаецца нязменна: *расчыніць, расчапіць, усчынаць, счышчаць, счапіць, бесчалавечна, расчышчаць, счарніць*.Ад такіх слоў трэба адрозніваць словы, у якіх корань пачынаецца спалучэннем *шч*:*расшчапіць* (палена), *прышчапіць*, *расшчодрыцца*, *адшчапіць*, *сашчаміць*.

З а ў в а г а. У словах *шчасце, шчаслівы, рошчына, нашчадак, нішчымны, нішчымніца* гістарычна замацавалася фанетычнае напісанне *шч*.

На стыку прыстаўкі і кораня можа падвойвацца зычны *з* або *с*: *бяззбройны, бясспрэчны, рассейваць, раззлавацца*.

З а ў в а г а. У некаторых словах адбылося зліццё гукаў на стыку прыстаўкі і кораня. У такім выпадку пішацца адна літара *с*: *расада, расаднік, расадны, расол, расольнік, расольны, ростань*.

3. Калі корань слова пачынаецца збегам зычных,пасля прыставак на зычны паяўляецца беглы гук [а]: ***пада**браць, **раза**слаць, **аба**гнаць, **надa**рваць, **ада**грэць, **са**браць, **са**скочыць, **са**гнуць*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З а ў в а г а. *Пада-*, *раза-*, *аба-*, *нада-*, *ада-*, *са-* --фанетычныя варыянты прыставак *пад-*, *раз-*, *аб-*, *над-*, *ад-*, *с-*.

Пры спалучэнні прыставак (*аб-*, *ад-*, *над-*, *пад-*, *раз-*, *з-* (*с-*), *уз-*, *спад-перад-*, *дэз-*, *суб-* са словамі, што пачынацца з *і* , у адпаведнасці з вымаўленнем замест *і* пішацца *ы*: *абыграць,абынтэлігенціцца, зымправіза ваць, зыначаны, зысці, сысці, адыграць, адыменны, адыходзіць, сыграцца, сышчык, узыход, спадылба, спадыспаду, перадынфарктны, падынтэграваць, разысціся, перадымперскі, перадыспытны, субынспектар, дэзытэгратар, дэзынфармацыя, дэзынфіцыраваць*.

З а ў в а г а. 1. У словах, утвораных ад дзеясловаў *ісці, хадзіць,*прыстаўкі на *з-* пішуцца ў залежнасці ад лексічнага значэння: *зысці—сысці, зысціся—сысціся, зыходзіць—сыходзіць, зыходзячы—сыходзячы, зыходны—сходны, сыходны—зыходны*.

2. У прыстаўцы *дыз-* перад галоснымі (у тым ліку ётавымі) пішацца *з*, а перад зычнымі—*с*: *дызасацыяцыя, дызартрыя, дыз'юнкцыя, дысгармонія, дыспрапорцыя, дысфункцыя, дыскрэдытаваць, дыскамфорт*.

3. Прыстаўка *дэз*-пішацца нязменна: *дэзактывацыя, дэзарыентацыя,дэз-ынфекцыя, дэзынтэграцыя,дэзурбанізацыя*.

Пасля частак (прэфіксоідаў) ( *звыш-*, *між-*, *пан-*, *супер-*, *транс-*, *контр-*) *і* захоўваецца: *звышімклівы, звышіндустрыяльны, звышінфляцыя, міжірыгацыйны, міжінстытуцкі, панісламізм, контрідэя, контрігра, суперінтэлект, трансіндыйскі*.

Заўсёды пішуцца нязменна запазычаныя прыстаўкі *анты-*, *дэ-*, *экс-*, *віцэ-*, *рэ-*, *ультра-* і інш.: *антываенны, антымілітарысцкі, дэмабілізацыя, экс-чэмпіён, рэканструкцыя, ультралевы*.

## 3.2Заданні для самастойнага выканання

№1. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***й***:

1) productionады…сці;
2) ня…начай;
3) за…грыванне;
4) пад…граць;
5) вы…сці.

№2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***з***:

1) бя…ветраны;
2) ра…сейваць;
3) …няволіць;
4) у…класці;
5) …часаць.

№3. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***ш***

1) ра…часаць (валасы);
2) у…чуванне (матуліна);
3) ра…чыніць (дзверы);
4) ра…чыніць (цеста);
5) пры…чапіць (парастак).

№4. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба ўставіць літару ***а***:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) раз…гнуцца;
2) аб…капаць;
3) аб…гнуць;
4) над..трэсці;
5) пад…браць.

№5. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***ы***:
1) спад…лба;
2) звыш…інтэлігентны;
3) без…дэйнасць;
4) суб… нспектар;
5) між…інстытуцкі.

№6. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***і***:
1) сан…структар;
2) з…мшыць;
3) за…кацца;
4) раз…грацца;
5) дэз…нфармацыя.

№7. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***ы***:
1) уз…ходжанне;
2) між…мперыялістычны;
3) с…грацца;
4) контр…гра;
5) раз…ходзіцца.

№8. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) надыйсці;
2) прайлюстраваць;
3) неімаверны;
4) неістотны;
5) падымаць.

№9. Адзначце словы, у напісанні якіх дапушчаны памылкі:
1) пераісці;
2) дэзінфекцыя;
3) звышімклівы;
4) спадыспаду;
5) узкласці.

№10. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) сыходны (пункт погляду);
2) дызпрапорцыя;
3) дызгармонія;
4) зыходзячы (з лесвіцы);
5) сходны (дзень).

№11. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) расольнік;
2) расаднік (хваробы);
3) расчапіць (бервяно);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) расчапіць (аконныя кручкі);
5) ростань.

№12. Адзначце словы, у напісанні якіх дапушчаны памылкі:

1) рашчахліць;
2) росчырк (пяра);
3) дызкамфорт;
4) расшпілены;
5) рашчараваецца.

№13. Адзначце правільна напісаныя словы:

1) ультра-гук;
2) антываенны;
3) экспрэзідэнт;
4) віцэ-адмірал
5) дэмантаж.

№14. Адзначце словы, у напісанні якіх дапушчаны памылкі:

1) ультраправы;
2) экс-чэмпіён;
3) анты-карупцыйны;
4) дэградацыя;
5) антыфашысцкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэма 4.Правапіс складаных, складанаскарочаных слоў

### 4.1 Правапіс галосных у складаных словах

Складаныя словы ўтвараюцца з дзвюх і больш асноў з дапамогай злучальных галосных або без іх: *далягляд, рознакаляровы, высакародны, землякоп, Салігорск, пяцігадовы.*

Злучальнымі галоснымі бываюць *а, о* (пасля цвёрдых асноў), *е, я* (пасля мяккіх асноў). Злучальная галосная *о* сустракаецца рэдка і бывае толькі пад націскам: *часопіс, куродым, ільновалакно*, а не пад націскам—*а:жывёвёлагадоўля, высакародны*; *я* пішацца ў словах, у другой частцы якіх націск падае на першы склад: *жыццярадасны, земляробства, сінявокі, баяздольны*; *е* пішацца, калі націск у другой частцы складанага слова падае не на першы, а на далейшыя склады: *зернесушылка, жыццесцвярджальны, землеркарыстанне.*

З а ў в а г а. Калі націск у другой частцы складанага слова падае не на першы, а на другі і далейшыя склады, то ў першай частцы ўзнікае пабочны націск і пад націскам замест *е* пішацца *ё*: *медагонка—мёдаварэнне, ледарэз—лёдадрабілка.*

У складаных словах, якія маюць дзве асновы, у адных выпадках *о* ў першай аснове захоўваецца, у другіх—пераходзіць у *а*. Гэта залежыць ад націску у другой частцы слова.

1. Калі націск падае на першы склад другой асновы, то ў першай аснове *о* пераходзіць у *а*: *чарнавокі, разнастайны, даўгавечны, паўнапраўны, Наваполацк, наваселле.*

2. Калі ж у другой частцы складанага слова націск падае не на першы, а на далейшы склад, тады ў першай частцы ўзнікае пабочны націск і пад націскам пішацца *о*: *чорнавалосы, featured рознабаковы, доўгачаканы, поўнагалоссе, Новасібірск, новабудоўля*.

З а ў в а г а. У некаторых складаных словах можа выразна праяўляцца пабочны націск і тады, калі асноўны націск падае на першы склад другой часткі. У такіх словах у першай частцы захоўваецца *о*: *мова-знаўства*, *усходазнаўства*, *азотнакіслы*, *торфаўборачны*, *збожжаздача*, *збожжаўборка*, *збожжасховішча*, *марозаўстойлівы*.

3. Складаныя словы, у якіх першая частка—лічэбнік *адзін* (*адна*), не маюць пабочнага націску і пішуцца як простыя словы, незалежна ад месца націску ў другой частцы: *аднастайны*, *аднаразовы*, *аднагадовы*, *адначасовы*, *адназначны*, *аднапавярховы*, *аднаскладовы*, *аднагалосна*, *аднагодак*, *аднадушна*.
4. У складаных словах часткі *што*-, радыё-, *дзевяноста*-, *свое*-, *фота*-, *мота*-, *контр*- пішуцца нязменна з *о*, *ё*, *е*: *штодзень*, *штогод*, *штотыднёвік*, *радыёстанцыя*, *радыёхваля*, *дзевяностатысячны*, *своеасаблівы*, *своечасовы*, *фотавітрына*, *фотахроніка*(але *фатаграфія*), *мотагонкі*, *мотакрос* (але *матацыкл*, *матавоз*), *контрудар*.

З а ў в а г а. Трэба адрозніваць часткі *радыё*- (пішацца нязменна) і *радые*- (*радыя*-) (хімічны элемент) : *радыёперадача*, *радыёхвілінка і радыяхімія, радыебіялагічны*.

5. У словах з першай часткай *кіна*-заўсёды пішацца *а* , незалежна ад месца націску ў другой частцы слова: *кінастудыя, кіначасопіс, кінафільм*.
6. Частка *полі*- пішацца згодна з агульнымі правіламі: з *а*, калі націск у другой частцы складанага слова падае на першы склад, і з *о*, калі націск падае не на першы склад другой часткі: *політэхнічны*, *паліклініка*, *палімеры*, *поліэтылен*, *полісемантычны*.
7. Складаныя словы, з першай часткай *поў*- маюць адзін націск; *поў*- пішацца толькі пад націскам , у словах *поўнач, поўдзень*, у астатніхвыпадках не пад націскам пішацца *паў*- (у адно слова з другой часткай): *паўкіламетра,паўрубля, паўтоны,паўмесяца*. Праз злучок *паў*- пішацца толькі з уласнымі назоўнікамі: *паў-Беларусі, паў-Азіі*.
8. Літара э ў першай частцы складаных слоў захоўваецца нязменна: *шэравокі*, *тэлебачанне*, *мэтазгодна*, *крэдытаздольнасць*, але: *шасцідзёнка*.
9. Калі ў складаным слове тры і больш асноў, кожная з іх мае свой націск, пад націскам *о* захоўваецца: *авіяматорабудаванне*, *паравозавагонабудаўнічы*.

### 4.2 **<u>Правапіс складаскарочаных слоў (абрэвіятур)</u>**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У абрэвіятурах скарочаныя часткі пішуцца так, як у адпаведных поўных словах: *гарсавет* (гарадскі), *прафсаюз* (прафесійны), *Еўрасаюз* (еўрапейскі), *заапарк* (заалагічны), *Беллітфонд* (беларускі, літаратурны), *камбат* (камандзір батарэі).

Літарныя, гукавыя абрэвіятуры і абрэвіятуры змешанага тыпу пішуцца вялікімі літарамі без кропак, злучкоў і апострафаў: *БДУ* (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт), *УА* (установа адукацыі), *НАН* Беларусі (Нацыянальная акадэмія навук Беларусі), *ЗАТ* (закрытае акцыянернае таварыства), *УП* (унітарнае прадпрыемства).

Калі да абрэвіятуры дадаецца лічба, то яна пішацца праз злучок: ВАЗ-21, МТЗ-82.

Калі абрэвіятура скланяецца, то канчатак пішацца малымі літарамі: у ЦУМе, у ЛіМе.

У пачатку састаўных частак складанаскарочаных слоў захоўваюцца літары *і, е, ё, я, ю* (пасля цвёрдых зычных), апостраф або раздзяляльны мяккі знак перад імі не пішуцца

Складанаскарочаныя словы, якія з'яўляюцца ўласнымі назвамі устаноў і арганізацый, пішуцца з вялікай літары: *Белкаапсаюз*, *Гомсельмаш*, *Палессеводбуд*.

## <u>4.3Заданні для самастойнага выканання</u>

№1.Адзначце словы, пры напісанні якіх трэба ўставіць літару ***о***:

1) р…знакаляровы;
2) р…знавіднасць;
3) д…браўпарадкаванне;
4) в…даносны;
5) в…данапорны.

№2. Адзначце словы, пры напісанні якіх трэба ўставіць літару ***а***:

1) зб…жжасховішча;
2) д…макіраўніцтва;
3) к…ксагазавы;
4) р…намерны;
5) ч…рнабровы.

№3. Адзначце правільна напісаныя словы:

1) рэдказубы;
2) рэдкаваты;
3) шэсцьсот;
4) торфаўборачны;
5) соракагоддзе.

№4. Адзначце словы, у напісанні якіх дапушчана памылка:

1) мотаспорт;
2) матацыкл;
3) вогняўстойлівы;
4) легкаатлетычны;
5) медазбор.

№5. Адзначце словы, у якіх дапушчана арфаграфічная памылка:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) землекоп;
2) ледадрабілка;
3) ільнасемя;
4) мнагазначны;
5) радкаслойны.

№6. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) шэраваты;
2) аднаразовы;
3) штамесячны;
4) легкадумна;
5) шэсцюстамі.

№7. Адзначце словы, пры напісанні якіх трэба ўставіць літару ***я***:
1) жыцц…радасны;
2) зерн…бабовы;
3) зерн…ўборачны;
4) briefly ради…небяспечны;
5) рады…хімія.

№8. Адзначце словы, пры напісанні якіх трэба ўставіць літару ***о***:
1) п…ўнач;
2) п…ліэтылен;
3) п…ўвёскі;
4) п…ўназначны;
5) п…лісемія.

№9. Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:
1) (паў) горада;
2) (паў) Клецка;
3) (паў) яблыка;
4) (паў) апельсіна;
5) (паў) Баранавіч.

№10. Адзначце словы, пры напісанні якіх трэба ўставіць літару ***о***:
1) ф…таграфія;
2) м…тацыкл;
3) дзевян…стагадовы;
4) м…такрос;
5) д…гажыхар.

№11. Адзначце абрэвіятуры, якія з’яўляюцца назоўнікамі мужчынскага роду:
1) ЛіМ;
2) СССР;
3) Белкаапсаюз;
4) ААН;
5) СНД.

№12. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) дзет’яслі;
2) дзяржюрвыдавецтва;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) прафком;
4) мясцкам;
5) Бел СЭ.

**6.Комплекснае заданне па праверцы ведаў**

Частка А

А1. Адзначце словы з вытворнымі асновамі:
1) бульба;
2) вясна;
3) сяўба;
4) ураджай;
5) вясёлка.

А2. Адзначце словы, у якіх ёсць канчатак:
1) павольна;
2) дэпо;
3) калышучы (дзеепрыслоўе);
4) прачытаны;
5) усклікнуў.

А3. Адзначце словы, у якіх назіраецца зліццё гукаў розных марфем:
1) яліна;
2) узвеяны;
3) хвоя;
4) сузор’е;
5) маёр.

А4. Адзначце аднакаранёвыя словы да слова ***гара***:
1) узгорак;
2) падгарэць;
3) гора;
4) гарысты;
5) горны.

А5. Адзначце слова з аманімічным коранем да слова ***стол***:
1) застольная (песня);
2) сталіца;
3) застолле;
4) застоліць;
5) настольнік.

А6. Адзначце словы, якія не маюць прыставак:
1) народны;
2) недаспелы;
3) нарыс;
4) напрамак;
5) нашчэнт.

А7.Адзначце словы, у якіх ёсць суфікс **–к-**:
1) бярэзнік;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) падаконнік;
3) дубняк;
4) халадзільнік;
5) блізкі.

A8. Адзначце словы, у якіх ёсць суфікс **–нік-**:
1) батанік;
2) палкоўнік;
3) злоснік;
4) маліннік;
5) чаёўнік.

A9. Адзначце словы, якія маюць чатыры суфіксы:
1) патрабавальна;
2) канцэнтравацца;
3) чарнічнік;
4) двайнік;
5) смешнік.

A10. Адзначце словы, у якіх прыстаўкі і суфіксы толькі формаўтваральныя:
1) наймілейшы;
2) падпісаць;
3) прыгажэй:
4) бегчы;
5) прыпынак.

A11. Адзначце зменныя формы дзеясловаў:
1) пасаджаны;
2) сказаць;
3) угледзеўшыся;
4) усклікнуў;
5) седзячы.

A12. Адзначце дзеепрыметнікі, якія маюць суфікс **–н-**:
1) пасаджаны;
2) вытаптаны;
3) скошаны;
4) знойдзены;
5) дачытаны.

A13.Адзначце словы з аднолькавай марфемнай будовай:
1) па-братняму;
2) павольны;
3) пяцёрка;
4) чорны;
5) адчыняючы (дзеепрыслоўе).

A14. Адзначце словы, якія ў сваім саставе маюць прыстаўку і суфікс (суфіксы) :
1) заходні;
2) няцвёрда;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) дагадзіць;
4) чарнаморскі;
5) упустую.

А15. Адзначце вытворныя словы:
1) Наднямонне;
2) абход;
3) казка;
4) калоссе;
5) падбярозавік.

А16. Адзначце прыметнікі, у аснове якіх пры ўтварэнні формы вышэйшай ступені параўнання адбываецца чаргаванне зычных:
1) мудры;
2) мяккі;
3) блізкі;
4) сіні;
5) густы.

А17. Адзначце словы, утвораныя суфіксальным спосабам:
1) аб'езд;
2) па-сучаснаму;
3) прыбліжэнне;
4) Занямонне;
5) лесапаркавы.

А18. Адзначце словы, утвораныя прыставачным спосабам:
1) падыход;
2) знаходка;
3) няшчасце;
4) прапрадзед;
5) Прыбалтыка.

А19. Адзначце словы,утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:
1) Пяцігор'е;
2) навушнік;
3) завязь;
4) пераразлік;
5) міжброўе.

А20. Адзначце словы, утвораныя бяссуфіксным спосабам:
1) сваяк;
2) уваход;
3) прадзед;
4) крык;
5) Зарэчча.

А21. Адзначце словы, утвораныя складана-суфіксальным спосабам:
1) аднакурснік;
2) вадаспад;
3) БелАЗ;
4) звышмагутнасць;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5) аднадумец.

A22. Адзначце словы, утвораныя постфіксальным спосабам:
1) каласіцца;
2) купацца;
3) усміхацца;
4) надумацца;
5) дапрыгацца.

A23. Адзначце словы, пры напісанні якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:
1) жыццяўстойлівы;
2) калесардэчны;
3) сябелюб;
4) ільнавалакно;
5) сінявокі.

A24. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) прадпрыймальны;
2) субінспектар;
3) звышідэйны;
4) трансыарданскі;
5) надысці.

A25. Адзначце словы, якія трэба пісаць разам:
1) (вела) спорт;
2) (паў) акна;
3) (контр) атака;
4) (экс) чэмпіён;
5) (перакаці) поле,

A26. Адзначце назоўнікі, якія трэба пісаць праз злучок:
1) (гуляй) поле;
2) (контр) адмірал;
3) (вярні) дуб;
4) (кілават) гадзіна;
5) (праца) дзень.

A27. Адзначце словы, у напісанні якіх дапушчана арфаграфічная памылка:
1) дзярж’юрвыдавецтва;
2) дзетяслі;
3) гарком;
4) лясгас;
5) філфак.

A28. Адзначце абрэвіятуры жаночага роду:
1) СНД;
2) СССР;
3) СНД;
4) БелТА;
5) ААН.

A29. Адзначце гукавыя абрэвіятуры:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) ЛіМ;
2) БДУ;
3) БНТУ;
4) СССР;
5) БАТУ.

А30. Адзначце правільныя сцверджанні:
1) дзеепрыметнік—самастойная часціна мовы;
2) у слове узня**ў** выдзелены суфікс з'яўляецца формаўтваральным;
3) пасля прыставак *суб-* , *дэз-* часам пішацца *і;*
4) у слове амаральны прыстаўка *а-* мае словаўтваральнае значэнне;
5) абрэвіятура ЦУМ з'яўляецца літарнай.

## Частка В

В1. Выпішыце слова, у якім ёсць суфікс:
1) бацька;
2) шапка;
3) ножка (стала);
4) свіны;
5) ледарэз.

В2. Знайдзіце і выпішыце слова, якое з'яўляецца "лішнім" па спосабу ўтварэння:
1) прыезд;
2) знішчэнне;
3) ураджай;
4) прыпарка;
5) доўга.

В3. Выпішыце слова з прыстаўкай **неда-**:
1) неабачлівы;
2) недарагі;
3) неабыякавы;
4) недасол;
5) непрыемна.

В4. Адзначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да падкрэсленага слова.
Упершыню мы сустрэліся ў Мінску (адказ запішыце лічбай).
1) утворана прыставачным спосабам;
2) утворана суфіксальным спосабам;
3) утворана-прыставачна-суфіксальным спосабам;
4) мае невытворную аснову;
5) утворана бяссуфіксным спосабам.

В5. Адзначце няправільнае сцверджанне ў дачыненні да падкрэсленага слова няголены (твар) (адказ запішыце лічбай):
1) мае вытворную аснову;
2) мае формаўтваральны суфікс;
3) з'яўляецца асобай формай дзеяслова;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) мае прыстаўку не-;
5) утворана суфіксальным спосабам.

В6.Знайдзіце слова, у якім дапушчана арфаграфічная памылка. Выпраўце памылку і адказ запішыце правільна.

1) паўапельсіна;
2) купленныя;
3) вогнеўстойлівы;
4) зернясклад;
5) радыёхваля.

В7. Выпішыце слова, утворанае прыставачна-суфіксальным спосабам:

1) шматтыражка;
2) ураджай;
3) прыпарка;
4) безбілетны;
5) недасолены.

В8. Дапішыце слова, якога не хапае ў сказе.

Разнавіднасцю напісання складанаскарочаных слоў з’яўляецца ... .

В9. Знайдзіце слова, у якім дапушчана арфаграфічная памылка. Выпраўце памылку і адказ запішыце правільна.

1) шэсцідзёнка;
2) матавоз;
3) фатаграфія;
4) звышінертнасць;
5) мясцкам.

В10. Выпішыце “лішнюю” абрэвіятуру па родавай прыналежнасці.

1) лясгас; 5)БелСЭ
2) БАМ;
3) экфак;
4) БДУ;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Інфармацыйна-даведачная частка

### Асноўная літаратура


1. Бадзевіч, З, І, Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / З, І, Бадзевіч, І, М, Саматыя.—Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2015, --288 с.
2. Валочка, Г, М, Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / Г, М, Валочка [і інш.],--Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі,2016,--240 с.
3. Валочка, Г, М, Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 кла са ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / Г, М, Валочка [і інш.],--Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2016,--256 с.
4. Давыдава, Г, М, Кантрольныя работы па беларускай мове для

слухачоў падрыхтоўчага аддзялення і падрыхтоўчых курсаў БДУ / Г, М, Да выдава, А,  М,  Гладун,--Мінск: БДУ, 2014,-- 79 с.
5. Квяткоўскі,  А,  А, Некаторыя праблемныя аспекты вывучэння раз дзела “Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія” пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання (з вопыту працы) / А,  А, Квяткоўскі,--Мінск: Беларуская мова і літаратура, №7 (177), 2016, с.29—32 .
6. Красней,  В,  П,  Беларуская мова:  вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / В,  П,  Красней,  Я,  М,  Лаўрэль,  С,  Р,  Рачэўскі,--Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2015,-- 320 с.

**Дадатковая літаратура**

7. Бадзевіч,  З,  І,  Курс беларускай мовы / З,  І,  Бадзевіч,  Л,  І,  Сямешка ,  І,  Р,  Шкраба,--Мінск: Універсітэцкае, 1996,--654 с.
8. Беларуская мова: падруч. для навучэнцаў педвучылішчаў і каледжаў: у 2 ч. / Я,  М,  Адамовіч, Л,  А,  Акаловіч, С,  К,  Берднік [і інш.],: Пад агул. рэд. Л,  М,  Грыгор’евай,--3-е выд., перапрац, і дап,--Мінск: Вышэйшая школа, 1998,--Ч.1,--330с.
9. Беларуская мова: падручнік для навучэнцаў педвучылішчаў і кале джаў : у 2 ч. / Я,  М,  Адамовіч, Н,  І,  Бурака, Л,  М, Грыгор’евай [і інш.],: Пад агул.рэд. Л,  М, Грыгор’евай,--2-ое выд, перапрац, і дап,--Мінск:Вышэйшая школа, 1998,--Ч.2,--222 с.
10. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад.рэд. А,  Я,  Міхневіча; Рэдкал.: Б,  І,  Сачанка (гал.рэд.) і інш,--Мінск:БелЭн, 1994,--655 с.
11. Сіўковіч,  В,  М,  беларуская мова ў пытаннях і адказах / В,  М,  Сіўковіч,--Мінск:Аверсэв, 2015.—765 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ